153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.56

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 228 (5602).
НЯДЗЕЛЯ
4
КАСТРЫЧНІКА
1936 г.
Год выдання XX

ПРОЛЕТАРЫІ УСЯХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НАЙВЯЛІКШЫ ДАКУМЕНТ ЭПОХІ

Праект новай Канстытуцыі, творцом і натхніцелем якой з'яўляецца правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін, з велізарным энтузіязмам сустрэнуты ўсёй совецкай краінай. Мільёны працоўных на сходах, у гутарках на заводах і ў калгасах, у школах і універсітэтах з небывалым уздымам абмяркоўваюць гэты гістарычны дакумент.

Сталінская Канстытуцыя — самая дэмакратычная з усіх існуючых у свеце канстытуцый. Яна выносіць канчатковы прыгавор капіталістычнаму свету, свету жабрацтва і кабалы, згіднасці і гнуснасці, свету соцыяльнай і нацыянальнай няроўнасці, свету фашысцкай дыктатуры, свету, дзе чутны стогны і рыданні народу, дзе кроў і жыццё працоўнага чалавека распэньваецца вельмі танна.

Сталінская Канстытуцыя на ўвесь свет абвясціла ганаровыя правы і свяшчэнныя абавязкі совецкага грамадзяніна:

Права на працу.
Права на адпачынак.
Права на асвету.

Гэта не дэкларацыя, гэта тое, што намі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўжо заваявана. Бурнае, хутка ўзрастаючае развіццё нашай прамысловасці, планавасць нашай гаспадаркі стварыла рэальныя гарантыі права на працу кожнаму працоўнаму. У нашай краіне няма эксплаатацыі, няма беспрацоўя. Кожны грамадзянін нашай цудоўнай краіны ўпэўнен, што заўтрашні дзень будзе яшчэ больш прыгожым, радасным, шчаслівым.

У нашай краіне праца з падневольнага і цяжкога ярма, якім яна лічылася раней, якім яна лічыцца цяпер у капіталістычных краінах, ператварылася «ў справу гонару, у справу славы, у справу доблесці і геройства». Яркі доказ гэтага — шырока разгорнуты стаханаўскі рух, мільёны людзей, якія паказваюць цуды высокапрадукцыйнай працы.

Якой хлусней, якім крывадушным гучаць абвешчаныя правы на працу ў буржуазных канстытуцыях! Права на працу, і ў той-жа час дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, якія паміраюць галоднай смерцю. Права на дапамогу, і ў той-жа час скарачэнне і без таго мізэрных дапамог. Не права на працу, а права на галоднае, халоднае існаванне, права на павольнае выміранне — вось што канстытуцыі капіталістычных дзяржаў гарантуюць працоўным.

Можна сабе ўявіць, што азначае «асабістая свабода», якая фармальна прадастаўлена буржуазнымі канстытуцыямі. У гутарцы з п. Рой Говардам таварыш Сталін указаў: «...мне цяжка ўявіць сабе, якая можа быць «асабістая свабода» ў беспрацоўнага, які ходзіць галодны і не знаходзіць прымянення сваёй працы. Сапраўдная свабода ёсць толькі там, дзе знішчана эксплаатацыя, дзе няма прыгнечання адных людзей другімі, дзе няма беспрацоўя і жабрацтва, дзе чалавек не дрыжыць за тое, што заўтра можа страціць работу, жыллё, хлеб. Толькі ў такім грамадстве магчыма сапраўдная, а не папяровая, асабістая і ўсякая іншая свабода».

Кожны совецкі грамадзянін адчувае рэальнасць і другіх праў, прадастаўленых яму сталінскай Канстытуцыяй. Права на працу дапоўнена правам на адпачынак і правам на асвету. Сотні тысяч прыгожых школ для нашай шчаслівай дзетвары, дзесяткі тысяч вышэйшых навучальных устаноў, бясплатнае навучанне і сістэма дзяржаўных стыпендый, густая сетка дамоў адпачынку, санаторый, курортаў, клубаў, штогодныя адпачынкі з захаваннем заработнай платы, забяспечаная старасць — усё, за што працоўныя вякамі змагаліся, ажыццёўлена практычна ў нашай краіне.

У нас ажыццёўлена роўнапраўе жанчын. Совецкія жанчыны народзілі з мужчынамі праяўляюць гераізм, працоўныя подвігі, яны гатовы, калі гэта патрэбуецца, да апошняй кроплі крыві, да апошняга ўздыху пагеройску абараняць сваю радзіму— краіну соцыялізма.

Наша партыя, партыя Леніна—Сталіна, заўсёды адстойвала прынцып роўнапраўя народаў і ў суровай барацьбе са шматлікімі ворагамі здолела ажыццявіць гэты прынцып, пабудаваўшы велічны непарушны будынак дзяржавы новага тыпу — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Там, дзе раней насаджалася варожасць і крывавая помста, цяпер квітнее дружба і ўзаемнае давер'е, там, дзе раней народы былі асуджаны на выміранне, цяпер квітнее шчаслівае жыццё.

Кожны працоўны Совецкай Беларусі адчувае гэта на сваім асабістым жыцці. Беларусь, якая ніколі да Вялікай пролетарскай Кастрычніцкай рэволюцыі не мела дзяржаўнасці, стала ў рэзультаце перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі квітнеючай рэспублікай фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, надзейным фарпостам Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Вялікія і ганаровыя правы совецкага грамадзяніна, свяшчэнныя яго абавязкі. Захоўваць Канстытуцыю СССР, захоўваць дысцыпліну працы, берагчы і ўмацоўваць соцыялістычную ўласнасць, абараняць пролетарскую бацькаўшчыну, бязлітасна змагацца з ворагамі радзімы,—вось чаго патрабуе соцыялістычнае грамадства ад кожнага грамадзяніна.

Совецкія грамадзяне — людзі самай свабоднай у свеце краіны, патрыёты сваёй радзімы—чесна выконваюць свае абавязкі. Рэкорды высокапрадукцыйнай працы множацца з кожным днём. Можна прывесці сотні і тысячы прыкладаў, калі совецкія людзі, рызыкуючы сваім уласным жыццём, выратоўваюць грамадскую ўласнасць. Рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгаснікі — усе ад малога да вялікага дапамагаюць байцам-пагранічнікам ахоўваць нашы межы. Служба ў Чырвонай Арміі лічыцца ў нас ганаровым абавязкам. Наш совецкі народ, які любіць сваю краіну, бязлітасна карае ворагаў радзімы.

Ва імя радзімы совецкія грамадзяне праяўляюць геройства, робяць подвігі. Ва імя радзімы байцы і камандзіры Чырвонай Арміі творацъ цуды ў ўладанні сваёй складанай баявой тэхнікай. Сваю радзіму абараняе ўвесь 170-мільённы народ.

Да комунізма, да светлай будучыні ўсяго чалавецтва пракладвае дарогу наша вялікая радзіма, якая прымае сталінскую Канстытуцыю.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Учора ў вялікай зале Дома партыйнага актыва адкрыўся пленум Менскага гаркома КП(б)Б.

З шырокім і грунтоўным дакладам аб выніках абмену партыйных дакументаў па менскай партарганізацыі выступіў сакратар Менскага гаркома КП(б)Б т. Хадасевіч.

У спрэчках па дакладу выступілі тт. Гінзбург (член пленума ГК), Каждан (начальнік палітаддзела Менскага аддзялення чыгункі), Старавойтаў (сакратар парткома друкарні імя Сталіна).

Сёння ў 6 гадзін вечара працяг работы пленума.

Аб аслабаненні т. Саакяна А. М. ад абавязкаў намесніка старшыні Совета Народных Камісараў і Эканамічнага Совета БССР

Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

Аслабаніць т. Саакяна, Ашота Міхайлавіча ад абавязкаў намесніка старшыні Совета Народных Камісараў і Эканамічнага Совета БССР, у сувязі з пераходам яго на другую работу.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Аб назначэнні т. Васермана С. І. народным камісарам комунальнай гаспадаркі БССР

Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Васермана, Саула Ісакавіча народным камісарам комунальнай гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Аб назначэнні тав. Амбражунаса П. О. намеснікам народнага камісара комунальнай гаспадаркі БССР

Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Амбражунаса, Пятра Осіпавіча намеснікам народнага камісара комунальнай гаспадаркі БССР, вызваліўшы яго ад абавязкаў народнага камісара комунальнай гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

З тіфліскай выстаўкі жывапісі, скульптуры і графікі на тэму: «Да гісторыі большэвіцкіх арганізацый Грузіі і Закаўказа». НА ЗДЫМКУ, карціна мастака В. КРАТКОВА: «ГУТАРКА ТАВАРЫША СТАЛІНА З ЛАДО КЕЦХОВЕЛІ».
Фото В. Тархова (СФ).

ВАЕННА-ФАШЫСЦКІ МЯЦЕЖ У ІСПАНІІ

Эвакуацыя дзяцей з Мадрыда

МАДРЫД, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). У сувязі з магчымасцю асады Мадрыда фашысцкімі мяцежнікамі, іспанскі ўрад рашыў эвакуяваць са сталіцы частку дзяцей. У першую чаргу эвакуіруюцца розныя дзіцячыя ўстановы, прытулкі і т. д. Ужо эвакуявана ў Валенсію (порт на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі) каля 1.500 дзяцей.

Зверствы мяцежнікаў

МАДРЫД, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). У Сарагосай правінцыі расстрэляна фашысцкімі мяцежнікамі ўжо больш 3 тысяч чалавек. Сярод расстрэляных амаль усе муніцыпальныя советнікі-антыфашысты. Адзін з советнікаў у Суэры быў расстрэлян з малалетняй дачкою. У сарагосай турме ў сучасны момант пакутуе 1.300 рэспубліканцаў.

Трупы расстрэляных валяюцца па вуліцах Сарагосы па некалькі дзён. Фашысты забараняюць іх убіраць. Робіцца гэта ў мэтах устрашэння насельніцтва.

Становішча на франтах

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Мадрыда, што іспанскае ваеннае міністэрства апублікавала зводку аб становішчы на франтах грамадзянскай вайны ў Іспаніі.

Паводле зводкі, урадавыя войскі, падтрыманыя авіяцыяй і артылерыяй, зрабілі атаку на часці мяцежнікаў у раёне Сігуэнсы, прымусіўшы іх адступіць. У Бухалансе (правінцыя Кардовы) ўрадавыя войскі прасунуліся на тры кілометры.

***

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка (БЕЛТА). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Гавас, рэспубліканскія войскі адбілі шматлікія атакі мяцежнікаў і ўмацавалі свае абарончыя лініі на біскайскім фронце (паўночнае ўзбярэжжа) ў раёне Эйбарб. Судны ўрадавага ваеннага флота працаўжаюць бамбардыраваць розныя пункты біскайскага ўзбярэжжа, захвачаныя мяцежнікамі.

Налёт самалётаў на Мадрыд

МАДРЫД, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння на світанні пасля доўгага перапынку фашысцкія самалёты прадпрынялі новы налёт на Мадрыд. Афіцыяльнае паведамленне гаворыць аб гэтым наступнае: «Сёння раніцою праціўнік прабаваў бамбардыраваць Мадрыд. 2 самалёты скінулі некалькі бомб на ўскраінах сталіцы, не прычыніўшы матэрыяльнай шкоды.

Выкрыта фашысцкая шпіёнская арганізацыя

ЛОНДАН, 3 кастрычніка (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Дэйлі геральд», у Мадрыдзе на сакрэтным сходзе арыштаваны 200 членаў фашысцкай шпіёнскай арганізацыі.

Газета таксама ўказвае, што ў Барселоне фашысты, перамаранутыя міліцыянерамі, тэрарызуюць насельніцтва з правакацыйнай мэтай. Фашысты, як паведамляе карэспандэнт «Дэйлі геральд», пранікаюць у рады міліцыі, каб весці падрыўную работу па заданнях фашысцкіх лідэраў.

ПЛЕНУМ ЛІГІ НАЦЫЙ

Выступленне дэлегацыі Брусельскага кангрэса міру

ЖЭНЕВА, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора адбылося неафіцыяльнае пасяджэнне пленума Лігі для заслухання прадстаўнікоў дэлегацыі Брусельскага кангрэса міру. У пасяджэнні прымалі ўдзел амаль усе дэлегацыі пленума, або ў поўным складзе, як французская, совецкая, чэхаславацкая і некаторыя іншыя, або ў асобе сваіх прадстаўнікоў, як англійская, швейцарская і інш. Пасяджэнні ўсіх камісій пленума былі спынены.

Старшыня пленума Лігі нацый Ламас, звярнуўшыся з прывітаннем да дэлегацыі, прадаставіў слова старшыні Брусельскага кангрэса міру лорду Сесілю, які быў спаткан апладысментамі.

Сесіль падкрэсліў аднадушнасць, з якой велізарны кангрэс у складзе звыш 4 тысяч дэлегатаў, прадстаўляўшых самыя рознастайныя плыні грамадскага жыцця, вынес рашэнне аб неабходнасці каардынацыі ўсіх намаганняў у барацьбе за мір.

Услед за лордам Сесілем выступілі прадстаўнікі розных камісій Брусельскага кангрэса.

Амаль усе прамоўцы падкрэслівалі велізарнае значэнне забеспячэння калектыўнай безапаснасці шляхам пагадненняў аб узаемнай дапамозе.

Словы Літвінава, што «мір непадзельны», стаўшыя лозунгам барацьбітоў за мір ва ўсіх краінах, многа раз паўтараліся з трыбуны.

Асаблівае ўражанне зрабіла выступленне Жуо (генеральнага сакратара французскай аб'яднанай усеагульнай канфедэрацыі працы), аб'явіўшага ад імя профсаюзаў, што абавязак рабочых — адмовіцца вырабляць або транспартаваць ваеннае спаражэнне для агрэсараў.

— У выпадку невыканання ўрадамі або Лігай нацый сваіх абавязкаў у момант пагрозы вайны,—заявіў Жуо, — профсаюзы павінны самі прымяняць эканамічныя санкцыі супроць агрэсара ці расшыраць іх.

ФРАНЦУЗСКАЯ КОМПАРТЫЯ ПАТРАБУЕ РАШУЧЫХ МЕР СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

ПІСЬМО ЖАКА ДЗЮКЛО

ПАРЫЖ, 1 кастрычніка. (БЕЛТА). Сакратар компартыі і віцэ-старшыня палаты дэпутатаў Жак Дзюкло звярнуўся да главы французскага ўрада Леона Блюма з пісьмом.

«Фашысцкія Лігі, — адзначаецца ў пісьме, — працаўжаюць існаваць пад новымі назвамі. Іх газеты па-ранейшаму выходзяць і правакуюць грамадзянскую вайну. Фашыстамі створаны склады зброі. На публічных сходах фашысцкія наймёты спакойна пагражаюць рэвольверамі. Прыхільнікі свабоды аддаюць сабе адчот у тым, што калі гэта будзе працаўжацца, калі не будзе прынята ніякіх мер пасля замаху ў горадзе Віен (маецца на ўвазе тэрарыстычны акт у часе загараднага свята мясцовай комсамольскай арганізацыі, калі адным фашыстам была кінута ў групу комсамольцаў бомба), калі Доржэр (лідэр фашысцкай арганізацыі, якая працуе сярод сялян) зможа арганізаваць перабоі ў снабжэнні сталіцы без таго, каб былі прыняты супроць яго энергічныя меры, мы рызыкуем убачыць ва Францыі грамадзянскую вайну, якую пачнуць ворагі народу».

Пісьмо заканчваецца выражэннем надзеі, што ўрад прыме меры, якія могуць перашкодзіць усякай спробе фашысцкіх змоўшчыкаў звярнуцца да гвалту, а таксама меры па пахтрымацнню грамадскага парадку.

***

ПАРЫЖ, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). Фашысцкая арганізацыя палкоўніка Дэ ля Рока, якая выступае зараз пад назвай «Французскай соцыяльнай партыі», аб'явіла на 2 кастрычніка скліканне мітынгу на зімнім веладроме ў Парыжы.

Камітэт па каардынацыі дзеянняў комуністаў і соцыялістаў Парыжскага раёна прыняў рашэнне адказаць на фашысцкую дэманстрацыю контрдэманстрацыяй.

У сувязі з гэтым урад забараніў як сход фашыстаў, так і антыфашысцкую контрдэманстрацыю.

У Наркамаце замежных спраў

Згодна атрыманых ТАСС вестак, перагаворы, якія вядуцца ў Маскве з красавіка 1935 года аб перагляде рыбалоўнай канвенцыі паміж СССР і Японіяй, зараз блізяцца к канцу.

2-га кастрычніка г.г. загадчык другога ўсходняга аддзела НКЗС тав. Б. І. Казлоўскі і паверaны ў справах Японіі ў Маскве п. Сако, якія вядуць перагаворы, канстатавалі дасягненне пагаднення ва ўсіх аспэктах пытанняў перагавораў і ўмовіліся прыступіць да рэдагавання тэксту падлягаючых падпісанню дакументаў. (БЕЛТА).

НА АБАРОНУ ІСПАНСКАГА НАРОДУ

ВАРШАВА, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). Згодна паведамлення газеты «Трыбуна роботніча», у Львове адбыўся масавы мітынг салідарнасці з іспанскім народам у яго барацьбе супроць фашысцкіх мяцежнікаў. На мітынгу прымала ўдзел звыш 2 тыс. рабочых, у пераважнай большасці украінцы, члены Львоўскага профсаюза будаўнічых рабочых (далучаецца да аб'яднання класавых профсаюзаў у Польшчы).

У прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі мітынга выражаюць свае гарачыя сімпатыі гераічнаму іспанскаму народу. У рэзалюцыі, у прыватнасці, гаворыцца:

«Сход будаўнічых рабочых у колькасці звыш 2 тыс. чалавек самым рашучым чынам кляйміць палітыку украінскіх буржуазных партый, палітыку, якая цалкам супадае з палітыкай крывавага генерала Франко—выкармыша замежнага фашызма. Сход таксама кляйміць нахабнае цкаванне з боку буржуазнага украінскага друку рэспубліканскага ўрада Іспаніі.

***

ЛОНДАН, 2 кастрычніка. (БЕЛТА). У Англіі расце рух салідарнасці з іспанскім народам. Ва ўсіх частках краіны адбываюцца сотні мітынгаў, на якіх прымаюцца рэзалюцыі, патрабуючыя аказання англійскім урадам дапамогі іспанскаму ўраду. Праводзіцца таксама збор грашовых сродкаў у фонд медычнай дапамогі рэспубліканскай Іспаніі. У Брыстолі адбылася канферэнцыя па аказанню дапамогі рэспубліканскай Іспаніі. На канферэнцыі прысутнічалі 100 дэлегатаў ад 35 арганізацый. Шматлюдныя мітынгі, на якіх былі сабраны буйныя грашовыя сумы на аказанне дапамогі рэспубліканскай Іспаніі, адбыліся ў Ліверпулі, Олдхэме і іншых гарадах.

Японская інтэрвенцыя ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 2 кастрычніка (БЕЛТА). Напружанасць становішча ў Шанхаі, у раёне Хонк'ю шпарка нарастае. Наперакор забароне ўлад, насельніцтва Чапея і Хонк'ю ўпякае на тэрыторыю міжнароднага сетльмента (квартала). Вуліцы, якія вядуць з Хонк'ю ў сетльмент, забіты тысячамі людзей і аўтамабілямі з бежанцамі і іх скарбам.

Трывожныя чуткі аб ваенных дзеяннях паміж Японіяй і Кітаем шырока распаўсюдзіліся сярод кітайскага насельніцтва. Узмоцненае патруляванне раёна Хонк'ю японскімі атрадамі, матацыклямі, узброенымі кулямётамі, устаноўка ва многіх пунктах дротавых загарод узмацняе трывожныя настроі ў горадзе.

ШАНХАЙ, 2 кастрычніка (БЕЛТА). Японскія газеты па-ранейшаму сцвярджаюць, што кітайскае камандванне спягвае к Шанхаю вялікую колькасць войск. Газета «Шанхай івнінг пост» таксама ўпамінае аб некаторых ваенных падрыхтаваннях кітайскага камандвання з мэтаю прадэманстраваць японцам гатоўнасць да адпору.

1-га кастрычніка, згодна вестак газет, у раёне Хонк'ю японскімі матросамі быў арыштован англічанін «за знявагу імператарскага флота». Японскія матросы затрымалі двух супрацоўнікаў газеты «Норт чайна дэйлі н'юс» за спробу сфатаграфаваць японскую заставу і дротавыя загароды.



Калгаснікі-фізкультурнікі БССР—удзельнікі ўсесаюзнай калгаснай спартакіяды ў Днепрапетроўску — на прыёме ў сакратара ЦК КП(б)Б тав. ВАЛКОВІЧА. НА ЗДЫМКУ (справа налева): тт. БЕНЕК, КАРТУКОЎ, ВАЛКОВІЧ, КУДЗЕЛЬКА, АЎГУСТАЙЦІС, КУЗНЯЦОЎ.
Фото В. Грунтфеста.

Еўрапейска-азіяцкая чыгуначная канферэнцыя ў Маскве

МАСКВА, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). 3 кастрычніка ў Маскве на заключным пасяджэнні еўрапейска-азіяцкай чыгуначнай канферэнцыі па грузавых зносінах падпісаны пратаколы на рускай, англійскай і нямецкай мовах.

У рабоце канферэнцыі, апрача дэлегацый чыгунак СССР і совецкага морскага транспарту, прынялі ўдзел дэлегацыі японскіх дзяржаўных чыгунак, 2 японскіх параходных таварыстваў, чыгунак Манчжоу-Го, германскіх, латвійскіх, літоўскіх і польскіх дзяржаўных чыгунак.

Як паведаміў супрацоўніку ТАСС старшыня канферэнцыі — член камісіі па міжнародных справах Народнага камісарыята шляхоў зносін тав. П. Н. Кірсанаў, — на пленарных пасяджэннях і ў спецыяльных тэхнічных камісіях канферэнцыі разгледжана каля 30 розных пытанняў.

У еўрапейска-азіяцкія грузавыя зносіны ўключаны польскія чыгункі.

ДАПАМОЖАМ ДЗЕЦЯМ І ЖАНЧЫНАМ ПРАЦОЎНЫХ ІСПАНІІ!

Да падзей у Іспаніі. НА ЗДЫМКУ: жанчыны і дзеці—бежанцы з Іруна—ў Эндэй (Францыя).

У ФОНД БРАЦКАЙ ДАПАМОГІ

* — Фашысты імкнуцца накінуць пятлю на шыю народных мас Іспаніі, але гэта ім не ўдасца. Гераічны іспанскі народ разгроміць фашысцкіх мяцежнікаў, — пішуць настаўнікі **замацкай школы,** Чашніцкага раёна. Калектыў настаўнікаў адлічыў дзённы заработак у карысць жанчын і дзяцей Іспаніі. Ужо сабрана і пераведзена 205 рублёў. Збор сродкаў прадаўжаецца.

* — Мы з хваляваннем сочым за мужнай барацьбой іспанскага народу за свабоднае жыццё. Іспанскі фашызм імкнецца патапіць у крыві дэмакратычную рэспубліку, але мы ўпэўнены, што перамогу атрымаюць працоўныя, — пішуць рабочыя **падстанцыі БелДРЭС** г. Шклова.

* — Мы, дзеці пчаслівай краіны Саветаў, хочам дапамагчы працоўным Іспаніі хутчэй разграміць ашалеўшых фашыстаў. Для гэтага мы сабралі 220 рублёў. Няхай жыве брацкая салідарнасць народаў! — пішуць вучні школы шклозавода **«Кастрычнік»,** Асіпавіцкага раёна.

* Рабочыя і работніцы **ветрынскага ільнозавода** з вялікім уздымам правялі збор сродкаў у карысць жанчын і дзяцей Іспаніі. Пасля мітынгу сабралі 120 рублёў. Грошы ўжо ўнесены.

* Калектыў настаўнікаў школ **Бабініцкага** сельсовета, Ветрынскага раёна, сабраў у фонд дапамогі працоўным Іспаніі 177 рублёў.

* На мітынгу ў саўгасе **«Новы шлях»,** Уваравіцкага раёна, пастаноўлена адлічыць цаўпроцента месячнага заработку. «Рабочыя саўгаса «Новы шлях»,—гаворыцца ў рэзалюцыі, — выказваюць сваю глыбокую нянавісць да германскіх і італьянскіх фашыстаў, якія дапамагаюць іспанскім мяцежнікам знішчыць дэмакратычную рэспубліку. Мы вітаем гераічны іспанскі народ!».

* На агульным сходзе ўсіх членаў **арцелей Крычава** выступіў стаханавец **швейнай** арцелі Дубкоў. Ён гаварыў аб гераічнай барацьбе іспанскага народу і прапанаваў, у знак салідарнасці, адлічыць адзін процант заработку ў карысць працоўных Іспаніі. Гэту прапанову сход сустрэў горача і прыняў аднагалосна.

* У цэхах **магілёўскага скурзавода імя Сталіна** абмяркоўвалася адозва рабочых **маскоўскага аўтазавода імя Сталіна.** Аднагалосна пастаноўлена адлічыць чвэрць дзённага заработку ў фонд дапамогі працоўным Іспаніі.

* У адказ на адозву рабочых **маскоўскага аўтазавода імя Сталіна,** работніцы і жонкі рабочых станцыі **Лепель** сабралі ў фонд дапамогі 204 рублі.

* Работнікі полацкага **кінотэатра «Інтэрнацыянал»** арганізавалі дадатковыя кіносеансы, сродкі ад якіх павінны пайсці на карысць жанчын і дзяцей Іспаніі. **Ужо** сабрана 739 руб. 20 кап. Апрача таго **комсамольцы-механікі** кінаперасовак на вёсцы арганізавалі дадатковыя кіносеансы ў калгасах раёна.

* — Няхай жыве гераічны іспанскі народ, які мужна змагаецца за сваю незалежнасць! — такі лозунг вывешаны ў клубе саўгаса імя Розенгольца (Магілёўскі раён). З вялікім уздымам прайшоў мітынг рабочых саўгаса, прысвечаны іспанскім падзеям. Пажылая работніца Ліхунова прапанавала адлічыць дзенны заработак у карысць працоўных Іспаніі. Гэта прапанова аднадушна прынята.

МІТЫНГІ У КАЛГАСАХ БЯГОМЛЬШЧЫНЫ

БЯГОМЛЬ. Ва ўсіх калгасах раёна ідзе збор сродкаў у дапамогу жанчынам і дзецям Іспаніі.

На мітынгу калгаснікаў і калгасніц арцелі **«Комінтэрн»,** Недальскага сельсовета, быў зачытаны заклік іспанскага нацыянальнага жаночага камітэта барацьбы супроць вайны і фашызма.

На мітынгу ў калгасе **забрана** 202 рублі.

Калгаснікі арцелі **«Шлях Будзілаўкі»** ў сваёй рэзалюцыі пішуць:

«Мы горача вітаем герояў іспанскага народу і жадаем ім ад усяго серца поўнай перамогі над фашысцкімі мяцежнікамі. Мы выказваем салідарнасць з працоўнымі Іспаніі і заўсёды гатовы дапамагчы ім».

Тут-жа на мітынгу калгаснікі адлічылі грошы ў фонд дапамогі. Калгаснік Богдан унёс заработак ад 20 працадзён, калгасніца Н. Цвірко — ад 13 працадзён. На мітынгу не аказалася ні аднаго чалавека, які-б адмовіўся дапамагчы жанчынам і дзецям Іспаніі.

Комсамольская арганізацыя Мсціжскага сельсовета сабрала ў карысць іспанскага народу 220 рублёў.

П. ШУРАЎ.

Хроніка паступлення сродкаў

У беларускае аддзяленне Дзяржаўнага банка Саюза на бягучы рахунак № 150162 у фонд дапамогі жанчынам і дзецям гераічнага іспанскага народу ад працоўных Менска, гарадоў і раёнаў БССР 1 кастрычніка паступіла 39.346 руб. 44 кап. 2 кастрычніка паступіла 35.042 руб. 35 кап. Усяго паступіла 297.272 руб. 31 кап.

НОВЫ ВЫТВОРЧЫ ЎЗДЫМ СЯРОД ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Работнік **«Звязды»** звярнуўся па тэлефону да начальнікаў палітаддзелаў аддзяленняў эксплаатацыі з запытаннем, якія вынікі першых дзён работы па новых правілах тэхнічнай эксплаатацыі.

Начальнік палітаддзела Віцебскага аддзялення тав. Васількоўскі па гэтаму поваду паведаміў наступнае: з 1.034 работнікаў эксплаатацыі, здаўшых іспыты па ўсваенню новых тэхнічных правіл тэхнічнай эксплаатацыі, 447 здалі на «добра». 94 — на «выдатна» і 393 — на «пасрэдна».

З вялікім уздымам прайшлі сходы работнікаў эксплаатацыі і іншых служб, прысвечаныя ўвядзенню новых правіл. 5.003 чыгуначнікі ўжо далучылі свае подпісы да калектыўнага абяцання таварышу **Сталіну** бездакорна выконваць правілы.

Першыя два дні работы па новых правілах тэхнічнай эксплаатацыі паказалі добрае ўсваенне іх. Ніводнай аварыі і крушэння за гэты час не было. План пагрузкі перавыкананы.

Начальнік палітаддзела Асіпавіцкага аддзялення тав. Фільковіч паведаміў наступнае: «За першыя два дні работы па новых правілах тэхнічнай эксплаатацыі аддзяленне не мела ніводнай аварыі, ніводнага выпадку браку ў рабоце. План пагрузкі выкананы, пры адначасова паніжаным вагонным парку.

Рад чыгуначнікаў паказваюць узоры барацьбы за сацыялістычную прадукцыйнасць. Грузчык станцыі Пухавічы тав. Кравулька разгрузіў платформу **каменя** ў 16,5 тоны за 30 мінут. Машыніст дэпо Асіпавічы тав. Панамараў правёў поезд па ўчастку Слуцк—Асіпавічы, развіўшы тэхнічную хуткасць у 41,3 кілометра пры норме 36,8. Машыніст Мінаеў вёў пасажырскі поезд з хуткасцю 42 кілометры пры норме 32,8 кілометра.

Усюды праходзілі агульныя сходы рабочых, дзе чыгуначнікі аднадушна падпісвалі калектыўнае абяцанне таварышу **Сталіну** дакладна выконваць новыя правілы. Сходы ператвараліся ў дэманстрацыю адданасці і любві да вялікага правадыра народаў таварыша **Сталіна.**

18 ГАДЗІН РАБОТЫ ПА НОВЫХ ТЭХНІЧНЫХ ПРАВІЛАХ

ГОМЕЛЬ. 1 кастрычніка ўвечары ў тэатры імя Леніна адбыўся агульны сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых гомельскага вузла. Сход падвёў вынікі першых 18 гадзін работы вузла па новых правілах тэхнічнай эксплаатацыі.

З адпраўленых станцыяй Гомель 15 саставаў 14 адпраўлена без малейшага адступлення ад новых правіл. Чотка паступалі распараджэнні ад дзяжурных па станцыі. Паравознае дэпо забяспечыла бесперабойную падачу паравозаў. Добра прапаваў і вагонны ўчастак: адрамантавана 54 вагоны з адцэпкай і 118 без адцэпкі. Час рамонту ў пункці з 109 мінут скарочан да 10-ці. У гэты дзень сярэднесутачны прабег пасажырскага паравоза даў 443 кілометры пры норме 320. Тэхнічная хуткасць павялічылася з 30,5 да 35,8 кілометра.

Машыніст комсамольскага паравоза т. Ёлкін, выступаючы на агульным сходзе, указаў на існуючыя заніжаныя нормы па тэхнічнай хуткасці на некаторых участках. Ён патрабаваў павелічэння хуткасці для свайго паравоза да 35 кілометраў у гадзіну (яму дана хуткасць 33 кілометры).

Вылучены і некаторыя зрывы і нязладжанасць у рабоце пасобных звенняў. Рагачоўскае аддзяленне затрабавала з Гомеля рэзервны паравоз, а ў той-жа час патрабуемае само адправіла ў Гомель. На станцыі Гомель заўважана адступленне ад тэхнічных правіл пры вымярэнні буферных дэталей.

Сход прайшоў з выключным уздымам. Упамінанне імя таварыша **Сталіна** і яго вернага саратніка таварыша Кагановіча выклікала буру авацый і крыкі «ўра».

(БЕЛТА).

Перадавыя брыгады будаўнікоў

ОРША. Брыгада землякопаў па будаўніцтву стадыёна станцыі Орша на чале з тав. Дубавіком 1 кастрычніка, у першы дзень стаханаўскай дэкады на чыгуначным транспарце, выканала вытворчае заданне на 207 проц.

Брыгада Матусенкі да стаханаўскай дэкады давала 130—140 проц. нормы, а ў першы дзень дэкады выканала норму на 181 проц.

Паміж брыгадамі і асобнымі будаўнікамі разгортаецца спаборніцтва за своечасовае сканчэнне будаўніцтва.

БАТУРЭНКА.

Малюнак польскага мастака Ю. ВЕРМУСА.

У МЕНСКІМ ГАРКОМЕ КП(б)Б

На пасяджэнні бюро 2 кастрычніка абмяркоўвалася пытанне аб практычных задачах менскай партыйнай арганізацыі ў сувязі з апублікаваннем пісьма ЦК ВКП(б) «Аб лікаванні прыёму новых членаў у ВКП(б)».

Абмеркаванне пісьма ЦК ВКП(б) у пярвічных партыйных арганізацыях сярод беспартыйных і комсамольцаў павінна быць праведзена распал кутом гледжання шырокага растлумачэння той нястомнай барацьбы, якую праводзіў Ленін, праводзіць Сталін за чыстату радоў нашай партыі, за непахіснасць арганізацыйных прынцыпаў большэвізма, за высокі гонар насіць званне члена ВКП(б). У якасці практычных мерапрыемстваў бюро гаркома прапанавала:

да 10 кастрычніка па ўсіх пярвічных партыйных арганізацыях правесці партыйныя сходы, на якіх разам з абмеркаваннем пісьма ЦК ВКП(б) паставіць даклад сакратара парткома або партыйнага арганізатара аб становішчы работы з кандыдатамі, спачуваючымі і комсамолам пад пунктам гледжання гатоўнасці гэтай партыйнай арганізацыі да аднаўлення прыёму ў партыю;

райкомам партыі вылучыць і накіраваць на дапамогу пярвічным партыйным арганізацыям для падрыхтоўкі і правядзення гэтых партыйных сходаў членаў бюро і пленумаў райкома і раённага партыйнага актыва з тым, каб забяспечыць усе пярвічныя партыйныя арганізацыі прадстаўнікамі райкома на партыйных сходах;

гаркому комсамола правесці спецыяльныя комсамольскія сходы для абмеркавання пісьма ЦК ВКП(б), горрайкомам КП(б)Б забяспечыць комсамольскія сходы дакладчыкамі з раённага партыйнага актыва.

У адпаведнасці з рашэннем пленума ЦК КП(б)Б прапанавана горрайкомам на працягу кастрычніка-лістапада праверыць ва ўсіх пярвічных партыйных арганізацыях пастаноўку работы з кандыдатамі і работу саміх кандыдатаў над сабой у справе падрыхтоўкі да пераводу іх у члены партыі.

Бюро гаркома таксама разгледзела пытанне аб палітычных масавых мерапрыемствах па падрыхтоўцы да надзвычайных VIII Усесаюзнага і XII Усебеларускага з'ездаў Саветаў.

Бюро абавязала партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя арганізацыі падрыхтоўку да з'ездаў Саветаў праводзіць як вялікую масава-палітычную кампанію, ахватваючы гэтай работай усе колы працоўных горада. Усю падрыхтоўчую работу да з'ездаў увязаць з падрыхтоўкай да XIX гадавіны Вялікай пролетарскай рэвалюцыі.

У аснову ўсёй палітычнай агітацыйнай работы павінна быць пакладзена глыбокае растлумачэнне працоўным сусветна-гістарычнага значэння VIII з'езда Саветаў, прысвечанага прыняццю сталінскай Канстытуцыі.

Уся падрыхтоўчая работа да з'ездаў павінна быць скарыстана для новага разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва, росту стаханаўскага руху, барацьбы за датэрміновае выкананне промфінплана, за гонар фабрычнай маркі, за справу рапарта з'ездам Саветаў аб дасягненнях у справе аўладання тэхнікай.

Бюро гаркома прапанавала райкомам партыі арганізаваць ва ўсіх калектывах гурткі для больш глыбокага вывучэння сталінскай Канстытуцыі, ахапіўшы гэтымі гурткамі беспартыйных рабочых і служачых. Арганізаваць у Доме партыйнага актыва і ва ўсіх партыйных габінетах наглядны агітацыйны матэрыял на тэмы: «Дарэволюцыйная і Совецкая Беларусь», «Дарэволюцыйны і совецкі Менск».

Для шырокага азнаямлення працоўных Менска з дасягненнямі соцыялістычнага будаўніцтва за апошнія гады арганізаваць рад экскурсій працоўных: у Палац піонераў, Дом Чырвонай Арміі, сталінскія школы, выстаўку рэканструкцыі горада Менска і т. д.

Гаркому комсамола прапанавана правесці нараду дэпутатаў горсовета комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, раённыя сходы моладзі нараджэння 1918 года, раённыя сходы жаночага комсамольскага актыва, гутаркі ў школах і піонерскіх атрадах.

У ГОРРАЙКОМАХ КП(б)Б МЕНСКА

На бюро Сталінскага, Кагановіцкага і Варашылаўскага горрайкомаў КП(б)Б абмяркована пісьмо ЦК ВКП(б) да ўсіх арганізацый партыі аб аднаўленні прыёму новых членаў у ВКП(б).

Па Сталінскаму горрайкому

Праведзены нарады сакратароў партыйных камітэтаў і партыйных арганізатараў, а таксама сакратароў комсамольскіх арганізацый, на якіх падрабязна распрацавана пісьмо ЦК ВКП(б) да ўсіх арганізацый партыі і перадавы артыкул «Правды»—«Захоўваць у чыстаце званне комуніста».

Выходзячы з дырэктыў гаркома дано ўказанне пярвічным партыйным арганізацыям да 6 кастрычніка распрацаваць пісьмо ЦК ВКП(б) з усімі кандыдатамі партыі, спачуваючымі, комсамольцамі і асобна з агітатарамі. Правесці гутаркі з рабочымі, служачымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі па ўсіх прадпрыемствах, совецкіх і навучальных установах.

З 7 па 12 кастрычніка намечана правесці партыйныя сходы з дакладамі сакратароў парткомаў і парторгаў аб падрыхтоўцы да прыёму ў партыю.

9 кастрычніка намечана правесці раённы сход кандыдатаў партыі, 15 — раённы сход спачуваючых і 16 кастрычніка — раённы сход комсамольскага актыва.

Па плану на кастрычнік намечана на бюро РК КП(б)Б заслухаць даклады аб рабоце з кандыдатамі партыі партарганізацыі ПЭП № 2, аб рабоце са спачуваючымі ў пярвічных партарганізацыях Акадэміі навук БССР і мясакамбіната і аб кіраўніцтве комсамолам у партарганізацыі завода імя Кірава.

Па Кагановіцкаму горрайкому

Прапанавана ўсім пярвічным партарганізацыям распрацаваць пісьмо ЦК ВКП(б), перадавы артыкул «Правды» — «Захоўваць у чыстаце званне комуніста».

Намечана паслаць групу таварышоў з раённага партыйнага актыва ў дапамогу невялікім партарганізацыям распрацаваць гэтыя матэрыялы з рабочымі і служачымі, дапамагчы гэтым пярвічным арганізацыям намеціць канкрэтныя мерапрыемствы для разгортвання падрыхтоўчай работы па прыёму лепшых людзей у партыю.

Па Варашылаўскаму горрайкому

Да 11 кастрычніка намечана правесці адзіны партдзень па распрацоўцы рашэння ЦК ВКП(б) аб аднаўленні прыёму ў партыю.

ПРАЎДА ПРА ПОЛЬСКУЮ ВЁСКУ

Марыя МІЛЬКЕВІЧ

«Вядомосці літэрацкіе». Варшава.

Варшаўскі інстытут сучаснай гаспадаркі апублікаваў вялікі том запісак сялян (каля 700 старонак); у яго ўключаны абшырныя адказы сялян з розных пунктаў Польшчы на анкету інстытута. У артыкуле Марыі Мількевіч прыведзены характэрныя вытрымкі з «Запісак сялян», сапраўднага дакумента, які сведчыць аб крайне цяжкім становішчы польскага сялянства.

Па вестках дзяржаўнага навуковага інстытута, у Пулавах дэфіцыт гаспадарак, свабодных ад падаткаў, складаў у сярэднім 90 злотых у месяц. Зразумела, няма чаго і думаць аб паляпшэнні гаспадаркі.

У вёсцы жудаснае беспрацоўе. Сельскагаспадарчыя рабочыя асуджаны на прадзельнае жабрацтва.

Зараз дзіная, сталая крыніца даходу некаторых малазямельных і беззямельных сем'яў—пенсія, якую атрымліваюць інваліды або ўдовы і сіраты забітых на вайне. Значыць, для таго, каб сям'я магла існаваць, малазямельнаму або беззямельнаму селяніну трэба было загінуць на вайне ці хаця-б вярнуцца з вайны калекам. Аднак «шчаслівых» удоў і калек не так ужо многа.

Рацыянальная гаспадарка ўжо ні ў малейшай меры не кампенсуе адсутнасці пабочных даходаў: усё, што вытварае малазямельны селянін, патлынаецца казной, ды і к таму-ж і вытвараецца з дэфіцытам.

У анкетах сяляне паведамляюць, што беззямельнаму рэдка ўдаецца працаваць больш 10—15 дзён у год. Беззямельныя працуюць за права пасадзіць крыху бульбы і капусты на чужой зямлі.

Беззямельныя плацяць за жыллё, але не ўносяць падаткаў. Малазямельныя ўносяць падаткі, але не плацяць за жыллё, у іх вельмі мала зямлі, яны не могуць пракарміць сям'ю ўласным хлебам. Таму прыходзіцца садзіць бульбу і капусту. Беззямельныя аддаюць сваю працу за права карыстацца кавалачкам чужой зямлі, на якой таксама садзяць бульбу і капусту. Наогул жыццёвы ўзровень малазямельных і беззямельных амаль аднолькавы, правільней — аднолькава нізак. Жыццё сераднякоў толькі крыху вышэй. Адзін з сялян піша: «Беззямельны і малазямельны косяцца на больш заможнага суседа, а той косіцца на іх. Гаспадар пабагацей перад новым ураджаем пазычае беднаму суседу чвэрць мукі і патрабуе, каб той пасля жатвы вярнуў тры чвэрці. Так адзін паядае другога».

У кнізе «Грып лютуе ў Направе», Ялу Курэк піша, што ў Направе, дзе асабліва многа малазямельных гаспадарак, сяляне прымешваюць ды і к таму-ж і вытвараецца з дэфіцытам.

У анкетах сяляне паведамляюць, што беззямельнаму рэдка ўдаецца працаваць больш 10—15 дзён у год. Беззямельныя працуюць за права пасадзіць крыху бульбы і капусты на чужой зямлі.

Беззямельныя плацяць за жыллё, але не ўносяць падаткаў. Малазямельныя ўносяць падаткі, але не плацяць за жыллё, у іх вельмі мала зямлі, яны не могуць пракарміць сям'ю ўласным хлебам. Таму прыходзіцца садзіць бульбу і капусту. Беззямельныя аддаюць сваю восеннюю харчаванне мясцовых жыхароў нездавальняючае. Нават у месяцы найбольшага «добрабыту» сяляне харчуюцца вельмі дрэнна, у страве іх няма ні бялкоў, ні тлушчаў.

Сяляне ўжываюць самую танную неачышчаную соль, па некалькі разоў гатуюць страву ў адной і той-жа салёнай вадзе. Яны вывараваюць бочкі з-пад селядцоў і гэты салёны адвар дабаўляюць да стравы.

Таксама і з цукрам. У Ржэшоўскім павеце большасць дзяцей ведае цукар толькі па цукерках, якія бачылі на кірмашы. Курэк расказвае, што ў Направе цукар наогул невядом. Сяляне пішуць, што аб цукру ім напамінаюць толькі плакаты «Цукар узмацняе здароўе». Так, яны ведаюць, што ад цукру здаравеюць не іх хворыя дзеці, а свінні англійскіх фермераў, якія купляюць польскі цукар па вельмі нізкіх цэнах.

І жывёле жывецца ў вёсцы вусім не салодка. Сялянам часта прыходзіцца прадаваць коней і кароў, пакуль тыя не загінулі з голаду. У польскай вёсцы галадаюць усе — людзі, коні, каровы, птушкі, нават зямля. Няма гною, і зямля становіцца бясплоднай. Гэта катастрафічна адбіваецца на ўраджайнасці.

Гарачая страва сельскагаспадарчых рабочых — гэта так званая «вадзянка», г. зн. бульба і капуста, звараныя без усякай прыправы і без солі, прытым у вельмі абмежаванай колькасці, бо нават перад новым ураджаем селянін задумваецца над тым, як яму пракарміць на працягу ўсяго года. «Але і ў такім «абедзе», — расказвае адзін селянін, — старэйшыя нярэдка адмаўляюць сабе дзеля дзяцей». Другі селянін піша, што зараз, калі дзеці плачуць ад голаду, адзіным выхадам для многіх з'яўляецца крадзеж. Уласнік трох моргенаў (морген — каля 0,25 гектара) піша: «Голад лягчэй сцярпець зімой, калі дні карацей і можна больш спаць. Аднак жах ахапляе, калі падумаеш, што я вымушан паміраць з голаду, хаця вакол так многа хлеба».

Нармальныя харчы з цукрам і соллю цяпер рэдкасць у вёсцы нават на вялікдзень і на каляды. Дзеці ў школе і ў царкве падаюць у непрытомнасць ад знясілення.

З-за пастаяннага недаядання сялян ствараецца перавытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў. Жабрацкая вёска закідвае імі жабрацкія гарады. Селянін вымушан прадаваць увесь ураджай, каб атрымаць некалькі грошаў на ўплату падаткаў, а рамеснік пазбаўлен магчымасці купляць гэтыя прадукты, бо ён беспрацоўны; у прамысловасці застой у выніку таго, што вёска не купляе тавараў. Ітак, галадаюць і сяляне і рабочыя. Голад гэты расце па меры накаплення прадуктаў, якія не маюць збыту.

Зачараванае кола. Краіна можа лёгка скаціцца ў бездонне. «Паліва ў Польшчы многа, а мы пакутуем ад холаду», — піша селянін у анкеце. У хаце сцены пакрыты інеем, у вёдрах замярзае вада, а снег, прыстаўшы к падэшвам у дварэ, у халодным пакоі не тае.

Людзі выходзяць з дому, каб сагрэцца, рухаючыся на марозе. Варочаюцца толькі на ноч. Каб хоць раз у дзень зварыць крыху гарачай ежы, сяляне збіраюць галлё, торф, крадуць дровы і вугаль. Паляць дошкі ад плота, нават пладовыя дрэвы з чужых і ўласных садоў.

Курэк піша аб мёртвых вокнах Паправы: «Па вечарах яна непрыкметна адыходзіць у змрок. Толькі часамі ў дамах, якія не ведаюць газы, гарыць свяча каля нябожчыка».

Жывыя-ж сядзяць упоцемках. Зімою дзеці не могуць рыхтаваць урокі. У такіх умовах вучыцца амаль немагчыма. Цемната, у якую пагружаны сялянскія хаты, нараджаюць другую цемнату — невуцтва.

Сялянскія хаты і дваровыя прыбудовы разбураюцца.

Нават дробны рамонт не па кішэні селяніну. Лопнуўшае шкло заклейваюць паперай, а калі вылеціць кавалак шкла, дзіру затыкаюць анучай.

Не маючы магчымасці плаціць рамеснікам, селянін па меры неабходнасці сам становіцца кавалём, цесляром, каменшчыкам, бондарам, сталяром, слесарам, кровельшчыкам, шкляром, рымарам і шмат чым яшчэ. Гэта вымушанае «самаабслугоўванне» вядзе да ўпадку земляробства. Адзін селянін піша, што ў яго няма пілы і замест яе ён карыстаецца сякерай, а ваду з калодзежа носіць жбанам, бо няма вядра. Калі яму патрэбен быў стол, ён разламаў прыбіральню ў дварэ і скарыстаў гэтыя дошкі. Праз некаторы час яму давялося зрабіць з стала дзверцы для хлева. Гэтыя дзверцы згрызла свіння, а новыя няма з чаго зрабіць. Цяпер няма ні прыбіральні, ні стала, ні дзверцаў у хлеве. У хаце выбіта шкло. Калёсы гніюць пад дажджом. У сабакі няма кануры. Гіне сад без агарожы.

У «Дарозе праз вёску» В. Бурэк апісвае хату, якіх вельмі многа ў польскай вёсцы: «Старэнькая, абдзёртая страха, пад ёй пакрыўленыя, прагнілыя сцены, нетынкаваныя, нябеленыя. Дзверы ледзь трымаюцца ў касяках, скрозь заплатаныя, у суцэльных шчылінах. У хаце вакол маленькіх акенцаў снег, сасулькі». Дададзім яшчэ, што хата не асветлена.

Пакрыўленыя, асеўшыя, сырыя хаты! Вока прывыкла ўжо да гэтага.

«Селянін без ботаў, конь без падкоў, а колы без абодзяў» — піша селянін.

Людзі абнасіліся, але нічога не могуць купіць. Даўно падралася не толькі рабочая, але і ранейшая святочная вопратка. У тых раёнах, дзе не сеюць ільну, няма нават даматкнай новай вопраткі. Авечак няма дзе пасвіць, і ў малазямельнага няма воўны на кажух. Многім няма на што купіць хаця-б адну пару лапцёў у год. Боты, здавалася-б даўно ўжо нягодныя, рамантуюць зноў і зноў: да залатаных вярхоў прырабляюць драўляныя падэшвы.

Лахманы, якія ў лепшыя часы былі-б выкінуты, цяпер ідуць у ход. У анкетах ёсць апісанне таго, як селянін, які мае зямлю, быў прымушан апрануць рызэё, знятае з агароднага пудзіла.

Школьнікі таксама не маюць вопраткі і абутку. У моцныя марозы яны прапускаюць лекцыі. Да марозаў дзеці ходзяць голымі. Усю зіму яны сядзяць у хатах, ахуганыя ў падзёртае рызэё і на паветра выходзяць толькі вясной. У паўночнай частцы Ржэшоўскага павета Міхалоўскі бачыў, як дзяцей увесь дзень трымаюць у мяшках з пасечанай саломай, каб яны не памерзлі ў неапаленай хаце. «Абутку і вопраткі ў крамах шмат, а мы мерзнем і галеча заядае нас», — піша адзін селянін.

Пакуль сяляне маўчаць, сціснуўшы зубы.

У вёсцы ціха, як у парахавым склепе, куды можа ўпасці іскра.

(Перадрукавана з журнала «За рубежом»).

НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ ЗАГАДУ НАРКАМАТА

(Пісьмо калгаснікаў)

Наш калгас «Ленінец». Лоеўскага раёна, знаходзіцца ад мястэчка Холмеч, Рэчыцкага раёна, на адлегласці 7 кілометраў.

Да восені 1935 года холмецкая больніца абслугоўвала наш калгас. З восені 1935 года работнікі больніцы абслугоўваць нас адмовіліся, матывуючы гэта тым, што калгас «Ленінец» не іх раёна.

— Калі хочаце, каб мы абслугоўвалі хворых вашага калгаса, — заявілі яны, — плаціце нам па 50 руб. у месяц.

Мы звярнуліся ў Наркамздраў БССР, каб ён абавязаў Рэчыцкі раённы аддзел аховы здароўя ўключыць наш калгас у зону абслугоўвання холмецкай больніцы, бо ад больніцы свайго раёна мы знаходзімся на адлегласці 24 кілометраў.

Наркамздраў нашу просьбу задаволіў. Але дырэктар холмецкай больніцы тав. Шараева не выконвае загаду Наркамздрава.

Нам прыходзіцца ездзіць у раённую больніцу за 24 кілометры, або плаціць холмецкай райбольніцы за лячэнне хворых.

М. ПУПАЧ, М. МАРЧАНКА, У. САМАНЧУК.

КАЛІ Я АТРЫМАЮ ПРЭМІЮ?

(Пісьмо культработніка)

У лютым 1936 года адбылася першая ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці рабочых свінасоўгасаў. У гэтай алімпіядзе прымаў удзел гурток мастацкай самадзейнасці соўгаса «Рэканструктар», Талачынскага раёна.

Журы алімпіяды пад кіраўніцтвам старшыні Рэспубліканскага камітэта рабочых свінасоўгасаў т. Рыса прэміравала наш гурток 800 рублямі і асабіста мяне, як кіраўніка — пуцёўкай на курорт. Гурток прэмію атрымаў, але я ніяк не магу атрымаць сваёй прэміі. Некалькі разоў я пісьмова зварачаўся да тав. Рыса з просьбай, каб хутчэй выдаў мне пуцёўку на курорт. Ён нават ні на адно пісьмо маё не даў адказу. Скардзіўся я і ў ЦК саюза свінагадоўчых соўгасаў у г. Маскву, які паведаміў, што дадзена распараджэнне тав. Рысу выдаць пуцёўку мне не пазней 10 верасня 1936 года.

Але гэта распараджэнне для Рыса, відаць, не закон. І на сёнешні дзень я не атрымаў пуцёўкі.

А. І. ГАЙДУК.

МАШЫНЫ СТАЯЦЬ ПАД ДАЖДЖОМ

(Пісьмо рабочага)

Пры Крупскім леспрамгасе ў гэтым годзе арганізован механізаваны пункт. Ён складаецца з 4-х магутных трактараў і 5 аўтамашын. Трэст Лесбела пры арганізацыі пункта зусім не пацікавіўся арганізацыяй добрай аховы машын. Сродкі для будаўніцтва гаража і майстэрні не вызначаны. Усе машыны стаяць пад дажджом, іржавеюць і псуюцца.

Работа аўтамашын і трактараў не арганізавана. Па планаваму заданню 5 аўтамашын павінны выпрацаваць 800 гадзін за дэкаду, а фактычна працавалі ўсяго 214 гадзін. Тры трактары працавалі 211 гадзін замест 480.

Будаўніцтва жылога дома праходзіць надта марудна. Жыллёвыя ўмовы рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў дрэнныя. Такое становішча, як відаць, зусім не турбуе кіраўнікоў трэста Лесбела і крупскі леспрамгас.

М. ЗМІЕЎСКІ.

ЧЫМ-ЖА ЗАНЯЦЦА ПАСЛЯ РАБОТЫ?

(Пісьмо калгасніка)

Не раз на агульных сходах калгаснікаў нашага калгаса «Чырвоная Беларусь», Бабруйскага раёна, гаварылі аб культурна-асветнай рабоце. Гаварылі аб гэтым і на праўленні калгаса. Ёсць нават некалькі пастаноў аб вызначэнні сродкаў на арганізацыю культработы.

Але ўсё гэта толькі пастановы. У сапраўднасці-ж грошы не скарыстоўваюцца, памяшканне для клуба не рамантуюць, абсталяванне раскідана, бібліятэка ўвесь час не замыкаецца, літаратуру распягнулі.

Старшыня калгаса Шчэдрынскі замест таго, каб арганізаваць калектыўнае радыёслуханне, забраў сабе на кватэру радыёпрыёмнік з клуба. Калгаснікам няма дзе культурна праводзіць вольны ад работы час.

СОБАЛЬ.

Па слядах неапублікаваных пісем

Селькор Л. пісаў нам аб шкодным дзейнасці старшыні калгаса «Леснікі», Латыгальскага сельсовета Сенненскага раёна Леснікова.

Сенненскі райком партыі паведаміў рэдакцыі, што факты працвердзіліся. Старшыня калгаса Леснікоў агульным сходам калгаснікаў з працы знят і справа аб яго шкодным дзейнасці перадана судова-следчым органам. Таксама знят з працы брыгадзір калгаса. Прыняты меры да знішчэння ўсіх прарываў у калгасе.

НАПЯРЭДАДНІ З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

„МЕРТВЫЯ ДУШЫ"

(Ад нашага карэспандэнта «Звязды»).

Бумажнік тав. Бесякова Самуіла перапоўнен рознымі дакументамі. Тут і членскі білет МОПР'а, Асавіяхіма і інш.

У гэтыя дакументы т. Бесякоў вельмі рэдка заглядвае, хіба толькі тады, калі папросяць уплаты членскіх узносаў.

Адзін толькі дакумент т. Бесякоў вылучыў асобна. Ён яго трымае ў верхняй кішані піджака і вельмі часта звяртаецца да яго. Гэта галоўным чынам бывае на трамвайных астаноўках. Каб прайсці праз пярэднюю пляцоўку трамвая, раптам паказваецца невялікая кніжачка, на вокладцы якой яркімі літарамі напісана: «Член Віцебскага гарадскога совета».

Гэтая самая любімая т. Бесякова кніжачка фігуруе не толькі на трамвайных астаноўках. Асабліва т. Бесякоў любіць ёю бравіраваць пры ўваходзе на ўсякія ўрачыстыя сходы, пасяджэнні, банкеты і т. д. Члену горсовета — асаблівы гонар і павага.

Але бываюць дні, калі гэта кніжачка ўсё-ж псуе т. Бесякову настрой, нават апетыт адбівае. Не верыцца, але гэта так. Гэта бывае пры затрыманні позваў з запрашэннем на пасяджэнні бюро комунальнай секцыі, пленуму або пры дачы прэзідыумам горсовета розных даручэнняў.

Забыў т. Бесякоў, што прыдзе час і яму ўсё-ж давядзецца адчытацца перад сваімі выбаршчыкамі, якія ўручылі яму гэты ганаровы дакумент члена гарадскога совета. Выбаршчыкаў менш усяго будзе цікавіць ці ўвайшоў Бесякоў праз пярэднюю пляцоўку трамвая, ці не. Выбаршчыкі яму проста заявяць: «А ну, паважаны т. Бесякоў, расскажы як ты апраўдаў вялікае давер'е працоўных горада, што ты канкрэтнага зрабіў па рэалізацыі нашага наказу».

А што яму гаварыць? У практычнай рабоце комунальнай секцыі, да якой ён прыманован, ён абсалютна нічога не зрабіў. На пасяджэнні бюро секцыі не з'яўляецца, не глядзячы на неаднаразовыя яму напамінкі.

А ў комунальнай секцыі горсовета процьма работы. Наказ выбаршчыкаў яшчэ не поўнасцю выкананы. Комунальныя дамы будуюцца марудна і дорага. Рамонт дамоў часта праводзіцца нядобраякасна. Многа недаробак ёсць па добрабыту горада, асабліва яго ўскраін. Дрэнна працуе асенабоз. Шмат дваро ў у горадзе, куды нельга зайсці з-за гразі.

Праўда, у рабоце комунальнай секцыі ёсць і станоўчыя бакі, як правядзенне рэканструкцыі трамвайнай лініі, асфальтаванне вуліцы імя Кірава і інш. Але ў гэтым «віны» Бесякова ніякай.

«Мёртвая душа». «Трамвайны дэпутат». Так т. Бесякова і празвалі ў сценах гарадскога совета. Але толькі празвалі. Паставіць справаздачу т. Бесякова перад выбаршчыкамі, давесці да іх ведама аб яго бяздзейнасці з тым, каб замест яго ў склад горсовета працоўныя паслалі таварыша, які-б сапраўды выконваў іх волю, у прэзідыума горсовета не хапіла смеласці.

Можа і хапіла-б смеласці, калі-б т. Бесякоў быў адзіным. Але такіх «мёртвых душ» і «трамвайных дэпутатаў» адказны сакратар горсовета, ён-жа загадчык оргмасавым аддзелам т. Егораў, налічыў звыш 60 чалавек. Гінзбург з Белхарчгандля, Сорын — старшыня швэйпромсаюза, Рыжынскі — старшыня сампрамсаюза, Грынберг — дырэктар шчоткамбіната, Марушкін — дырэктар фабрыкі імя Кагановіча, Лапін з аддзела гарадской сувязі, Іванова з фабрыкі «КІМ», Варшаўчык — інструктар гаркома партыі і іншыя (усіх не пералічыш) — усе яны таксама «мёртвыя душы», «трамвайныя дэпутаты» з Віцебскага гарадскога совета.

Дзіўна, чаму Віцебскі гарком партыі мірыцца з такім лібералізмам горсовета.

Вл. АСТРОЎСКІ. Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

РЫХТУЮЦЦА ДА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

ОРША. У сувязі з набліжэннем з'ездаў Советаў па раёну ўзмацнілася работа па абмеркаванню праекта сталінскай Канстытуцыі. За верасень працоўнымі раёна ўнесена 200 прапаноў і дадаткаў да праекта.

Ва ўсіх 10 калгасах Гальцаўскага сельсовета створаны гурткі па вывучэнню Канстытуцыі. У калгасе імя Сталіна гурткі працуюць у кожнай брыгадзе. Актыўна абмяркоўваюць кожны артыкул праекта Канстытуцыі калгаснікі Якаўлевіцкага сельсовета ў спецыяльна арганізаваных гуртках.

Сельсоветы раёна пачалі падрыхтоўку да справаздач перад выбаршчыкамі. Створана раённая выбарчая камісія. Сярод членаў камісіі — знатны брыгадзір калгаса «Чырвоны бераг» тав. Таугер, стаханаўка ільнокамбіната тав. Досікава і інш.

ПЕТРЫКАЎ. У калгасах і брыгадах актыўна абмяркоўваецца пісьмо калгаснікаў сельгасарцелі імя Сталіна, Менскага раёна, аб сустрэчы з'ездаў Советаў новымі перамогамі ў калгасным будаўніцтве. Калгаснікі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы па завяршэнню сельскагаспадарчых работ і паспяховаму выкананню абавязкаў перад дзяржавай.

Калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны пасёлак» абавязаліся да 10 кастрычніка закончыць уборку бульбы, зяблівае ворыва, агледзець і апляпіць усе памяшканні для жывёлы.

Петрыкаўскі горсовет намеціў рад мерапрыемстваў па ўпарадкаванню раённага цэнтра да з'ездаў Советаў: закончыць будаўніцтва новай дзіцячай кансультацыі, пусціць у эксплатацыю новую гасцініцу, агарадзіць усе двары новай агарожай, закончыць брукаванне двух вуліц. (БЕЛТА).

СПРАВАЗДАЧНУЮ КАМПАНІЮ ПАЧЫНАЮЦЬ НЕПАДРЫХТАВАНЫМІ

Толькі 1 кастрычніка ў Сіроціне склікалі нараду старшынь сельсоветаў па пытанню падрыхтоўкі да з'ездаў Советаў. Выступіўшыя на нарадзе сакратар райкома партыі тав. Румянцаў, загадчык райза Шчэрбакоў, упаўкамзаг Залескі і загадчык райфа Розенталь канстатавалі адставанне раёна па выкананню сельскагаспадарчых работ і фінплана.

Падрыхтоўка да надзвычайных з'ездаў праходзіць нездавальняюча. Два тыдні таму назад райком і райвыканком паслалі ў сельсоветы сваіх упаўнаважаных па арганізацыі абмеркавання сталінскай Канстытуцыі, але амаль ніхто з упаўнаважаных у сельсоветы не выязджаў. Пасля гэтага і не дзіва, калі ў райвыканком паступіла толькі некалькі дадаткаў і заўваг да праекта новай Канстытуцыі.

Дрэнна ў раёне разгорнута работа па падрыхтоўцы да справаздачных сходаў на выбарчых участках. 5 кастрычніка ў раёне пачынаюцца справаздачныя сходы, а райвыканком нават не заказаў яшчэ позвы выбаршчыкам.

АСТРОЎСКІ.

ТРЫБУНА СТАХАНАЎЦА

ПАТРАБУЕМ ШТОДЗЕННАЙ ДАПАМОГІ

Я працую два гады ў менскім вагонным дэпо брыгадзірам па рамонту вагонаў.

У маёй брыгадзе раней было шэсць чалавек. Я заўважыў, што работа ўшасцярых (рамонт адразу двух вагонаў) абязлічваецца. З выкананнем новых норм мы не спраўляліся.

Я прапанаваў разбіць брыгаду па тры чалавекі і прымацаваць да яе пэўны ўчастак работы. Кожная брыгада павінна рамантаваць свой вагон. Работа пайшла значна лепш.

У маю брыгаду ўвайшлі рабочыя-рамонтнікі таварышы Пралясловскі і Палазкоў. Спачатку гэтыя таварышы не былі стаханаўцамі. Яны нядаўна прышлі на вытворчасць, і мне прышлося прыкласці нямала сіл, каб дапамагчы ім у рабоце і ўзняць іх кваліфікацыю. Гэтых таварышоў я ўзяў пад свой кантроль. Штодзень дапамагаў ім асвойваць тэхніку рамонтнай работы і добра арганізоўваць стаханаўскае месца.

Звярнулі мы вялікую ўвагу на якасць змазкі букс. Змазка была вельмі дрэннай якасці, ад чаго буксы ў вагонах часта гарэлі.

Мы паставілі перад майстрам цэха пытанне аб забеспячэнні нас добрай змазкай. І мы дабіліся гэтага. Зараз буксы не гараць.

Брыгада мая дружная. Працуем энергічна і ўзгоднена. Рабочыя Пралясловскі і Палазкоў зараз з'яўляюцца стаханаўцамі. Новыя нормы мая брыгада выконвае на 220—230 проц.

Аднак, трэба прама сказаць, што ў дэпо адчуваецца за апошні час паслабленне кіраўніцтва стаханаўскім рухам. Намі, стаханаўцамі, перасталі цікавіцца і дапамагаць у рабоце. Майстры не здолелі пераключыцца на стаханаўскія метады работы. Вось, напрыклад, калі ўзяць нашага майстра Іваноўскага. Яго арганізатарскай ролі ў цэху не адчуваецца.

У дэпо чатыры рамонтныя брыгады. Дамкраты пры рамонце з'яўляюцца вельмі важным механізмам, але іх не хапае — усяго тры штукі, ды і тыя расхістаны, разьба ў іх спрацавана. Мы неаднаразова зварачаліся да цэхавай адміністрацыі, патрабуючы рамонту дамкратаў, але нічога канкрэтнага і да гэтага часу не зроблена. Дамкраты стаяць неадрамантаванымі.

Для таго, каб з буксы не выліваллася змазка, патрэбны лямцавыя шайбы, а ў нас іх няма. Змазка трацціцца неэканомна. Падсобны інструмент вельмі дрэнны. Зубілы тупыя і крохкія, яны вельмі часта ламаюцца і кожны раз прыходзіцца бегаць у інструментальную для абмену. На беганіну затрачваецца шмат часу.

Усё гэта, здаецца, «дробязі», аднак яны — вялікі тормаз у рабоце і не даюць брыгадам працаваць высокапрадукцыйна.

КАЗАК С. Д.

Брыгадзір стаханаўскай брыгады менскага вагоннага дэпо.

СТАХАНАЎЦЫ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ І ЛЕСАВЫВАЗКАХ

КРУПКІ. У калгасах раёна разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае выкананне гадавога плана лесазагатовак і вывазак. Калгас «Чырвоны трактар» на 26 верасня вывез 300 кубаметраў лесу (заданне 380). Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Колас» Левановіч Рыгор і Радзецкі Нікалай загатаўляюць штодзенна па 21 кубаметру драўніны замест нормы у 6,4 кубаметра.

Дэкаднае заданне яны выконваюць на 190—200 процантаў. Абодва стаханаўцы працуюць трыма піламі. Для кожнай пароды драўніны ў іх асобная піла з пэўнай адточкай і адпаведным разваротам зуб'яў.

Возчык калгаса «Маяк сацыялізма» Макарэвіч Ілья вывозіць да 38 кубаметраў дроў за дзень (норма 7). За дзень Макарэвіч зарабляе па 50 руб.

М. КАЛАЧЫНСКІ.

Будынак Грузінскага дзяржаўнага ордэна Леніна драматычнага тэатра імя Руставелі ў Тбілісі. Фото Д. Давыдава (ОФ).

ЗНАТНЫЯ ТРАКТАРЫСТЫ

Гав. Р. М. ЧУБАКОЎ.

Раман і Дзмітрый Чубакоў лічыліся ў мінулым ў вёсцы апошнімі людзьмі. Яны абодва былі пастухамі. Сухі хлеб, здзекі і слёзы былі для іх узнагародай ад сваіх гаспадароў.

У калгасе яны — лепшыя стаханаўцы. За ўдарную работу ў 1934 годзе радавы калгаснік Раман Чубакоў і Дзмітрый Ячмянёў былі пасланы на курсы трактарыстаў.

Малады трактарыст Ячмянёў упершыню сеў за руль трактара ў 1935 годзе, узяўшы сабе ў напарнікі свайго таварыша па вучобе Рамана Чубакова.

Вясною 1935 года Ячмянёў і Чубакоў прынялі выклік трактарысткі Капыльскай МТС Зоні Рачок і ўключыліся ў спаборніцтва за выпрацоўку 400 гектараў на трактар.

Аб сваёй рабоце Ячмянёў расказвае:

— Асаблівую ўвагу мы звярнулі на бягучы рамонт трактара, на фільтроўку гаручага і масла. У нашай рабоце многа дапамагло тое, што кожны трактар меў план па ўсіх відах работ. Наш трактар не меў ні адной аварыі. Усё гэта дало магчымасць у першы-ж год работы выпрацаваць 708 гектараў, зэкаміміць 2,5 тоны гаручага і заваяваць пяршынства ў рэспубліцы.

У канцы 1935 года Ячмянёў і Чубакоў у ліку іншых лепшых трактарыстаў былі прыняты таварышом Сталіным і кіраўнікамі партыі і ўрада. Тут маладыя трактарысты сустрэліся з лепшымі трактарыстамі нашай краіны, падзяліліся вопытам сваёй работы.

Раман Чубакоў з вялікім захапленнем расказвае аб сустрэчы з таварышом Сталіным і тут-жа дадае:

— Калі мы ехалі ў Маскву, то думалі, што далі на трактар самую большую выпрацоўку, але, паслухаўшы іншых трактарыстаў, зразумелі, што апрапавалі мала.

Чубакоў і Ячмянёў, будучы на Усесаюзнай нарадзе перадавікоў ураджайнасці, абяцалі таварышу Сталіну ў гэтым годзе даць на трактар 1.000 гектараў.

— Гэтага абяцання, — гаворыць Чубакоў, — мы не забывалі ні на мінуту, таму што мы яго далі таварышу Сталіну.

Вясною два сябры заключылі паміж сабой сацыялістычны дагавор на большую выпрацоўку, лепшую захаванасць трактара, якасць работы і эканомію гаручага.

Чубакоў, працуючы на трэцяй хуткасці, засяваў за 14 гадзін па 52 гектары. На ворыве пры норме 4 гектары заўсёды даваў па 8—9, а былі дні, што і па 12—13 гектараў узорваў.

У самы разгар палявых работ знатны брыгадзір тав. Чэчык атрымаў ад сакратара ЦК КП(б)Б гав. Гікало тэлеграму:

«ПК віншуе Вас з пяршынствам у рэспубліцы па выпрацоўцы на трактар.

Упэўнены, што ў далейшым Вы не здзіўсіце і перавыканаеце абяцанне 1.000 гектараў на трактар, маючы ў брыгадзе такіх трактарыстаў-стаханаўцаў, як Чубакоў, Ячмянёў, Шайко.

Прывітанне брыгадзе.

ГІКАЛО».

— Гэты дакумент, — гаворыць тав. Чэчык, — я хаваю, як лепшы падарунак ад сакратара ЦК КП(б)Б і пастараюся, каб уся брыгада мела на трактар 1.000 гектараў.

Словы стаханаўца-большэвіка не разыходзяцца са справай. Чэчык забяспечыў работу трактароў круглыя суткі.

Аб поспехах і метадах сваёй работы расказвае сам Чубакоў.

— У нашых поспехах ніякага сакрэту няма. Кожны трактарыст можа даць тое, што даў я і Ячмянёў. Метад маёй работы заключаецца напершае ў тым, што на кожную пяцідзенку я маю цвёрдае заданне ад брыгадзіра. Плошчу падбіраю такую, каб менш рабіць паваротаў і халастых пераездаў з аднаго месца на другое. Запраўку трактара праводжу ў баразне і на гэта трачу не больш 20 мінут. Кожны дзень праводжу бягучы рамонт машыны.

Трэба дабіцца, каб трактар меў пастаяннага возчыка вады і гаручага, каб у часе работы самому не адрывацца ад трактара. Масла заліваю праз спецыяльную лейку, якую сам зрабіў. Лейка гэта пазбаўляе работу, бо праз яе можна заліваць масла не падагрэўшы. Падагрэтае масла трапіць сваю вязкасць і ўкладышы ад такога масла хутка зношваюцца.

На ворыве я ўвесь час працую на другой хуткасці і на дабавачнай сумесі — вадзе. Гэтым я эканомлю па 3—4 кілограмы гаручага на гектар мяккага ворыва. Трактарысты, праўда, гэтаму не вераць, як гэта можна на вадзе працаваць, трактарыстам ўвесь час будзе глушыцца.

Калі трактар у часе работы нагрэецца, то тады можна працаваць на 13—14 кілограмах гаручага, супроць 17, дабаўляючы вады. Трактар ад гэтага не псуецца».

Такімі метадамі працуе і Ячмянёў. Усё гэта дало магчымасць Чубакову да 30 верасня выпрацаваць на трактары «ХТЗ» 1.260 гектараў і зэкаміміць гаручага 3.490 кілограмаў, а Ячменёву даць 1.187 гектараў і зэкаміміць 2.320 кілограм гаручага.

— Мы вельмі рады, — гаворыць Чубакоў, — што выканалі слова, данае намі таварышу Сталіну. Зараз у нас адна думка, — дагнаць трактарыстку Пашу Ангеліну, якая абавязалася даць на трактар 1.600 гектараў.

Два маладыя трактарысты даказалі, што слова сапраўднага стаханаўца-большэвіка не разыходзіцца са справай.

Два былыя пастухі сталі знатнымі трактарыстамі. Яны мелі гонар быць прынятымі таварышом Сталіным, маюць гонар атрымліваць ад сакратароў ЦК КП(б)Б тав. Гікало і Валковіча прывітальныя тэлеграмы.

А зараз за працоўны гераізм і выдатныя поспехі ў справе скарыстання трактароў у сельскай гаспадарцы Чубакоў і Ячмянёў узнагароджаны граматамі ЦВК БССР. Яны — знатныя людзі ордэнаноснай Рэспублікі.

Д. МАЛЕВІЧ.

НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ

(«Даходнае месца» А. Н. Остроўскага ў БДТ-3).

У мінулым годзе 3-ці Беларускі дзяржаўны тэатр святкаваў свой юбілей. Гэта быў юбілей 15-гадовай працы, росту, творчых шуканняў. Ад маленькай вандроўнай трупы да моцнага тэатральнага калектыва, які мае ўласную творчую арыентацыю, уласныя мастацкія кадры — такім быў шлях БДТ-3.

Год работы пасля юбілею паказаў, што тэатр канчаткова замацоўвае сваю рэалістычную накіраванасць, адзнакі якой носяць такія пастаноўкі, як «Мой друг», «Гісторыя пяці хвастоў», «Часаўшчык і курыца», адкідаючы тыя тэндэнцыі, якія перашкаджалі правільнаму творчаму росту тэатра і якія выявіліся ў фармалістычных пастаноўках: «Чужое дзіця» і «Рыкашэт». Здаровы, жыццездольны, творчы арганізм тэатра рашуча перамог фармалістычныя ўплывы, прынесеныя ў тэатр (шкодныя практыкаванні рэжысёра Разанава) і натуралістычную бытаўшчыну, якія на працягу раду год па інэрцыі трымаліся ў тэатры. Гэтыя элементы натуралістычнай бытаўшчыны з'яўляліся спадчынай часоў вандроўнага перыяду тэатра.

Зараз мы можам сказаць, што ў тэатры ў пошуках стылю развіваюцца дзве характэрныя асаблівасці.

Калі пастаноўка «Сержанта Дроба» (рэжысёр К. Саннікаў) сведчыць аб імкненні тэатра да стварэння спектакля рэволюцыйнай рамантыкі, у якім тэатр імкнецца паказаць пафас і героіку вялікай барацьбы пролетарыята на захадзе, то пастаноўка «Даходнага месца» паглыбляе рэалістычныя тэндэнцыі тэатра. Можна смела сказаць, што ў пастаноўцы «Даходнага месца» творчыя шуканні тэатра як-бы знаходзяць сваё завяршэнне. «Даходнае месца» з'яўляецца лагічным вынікам папярэдняга творчага развіцця тэатра і сведчыць аб упартай рабоце ўсяго калектыва тэатра над паглыбленнем сваёй сцэнічнай культуры і асабліва культуры акторскага выканання.

У гэтым сэнсе вялікую карысць тэатру прынесла прыцягненне да працы ў тэатры такога буйнага майстра сцэны, як заслужаны артыст рэспублікі Е. Міровіч.

Дружная і ўпартая творчая работа рэжысёра і ўсяго акторскага калектыва над камедыяй А. Н. Остроўскага прывялі ў выніку да стварэння глыбокарэалістычнага спектакля, сіла мастацкага ўздзеяння якога стаіць значна вышэй усіх папярэдніх пастановак гэтага тэатра.

Гэта для нас тым больш важна, што «Даходнае месца» з'яўляецца першым вопытам тэатра за ўсе 16 год яго існавання ў галіне асваення класічнай спадчыны. Тое, што тэатр абраў адну з складанейшых п'ес Остроўскага, у якой супярэчнасці светапогляду вялікага рускага драматурга выяўлены вельмі яскрава, гаворыць аб жаданні тэатра правяраць свае творчыя магчымасці на вельмі складаным і адказным драматургічным матэрыяле. Трэба сказаць, што тэатр здаў гэты экзамен з гонарам і пастанокаў «Даходнага месца» з'яўляецца ў гэтым кірунку этапнай. Разам з гэтым яна ўскладае на тэатр і пэўны абавязак на далейшае — гэта значыць, што совецкі глядач мае ўсе падставы чакаць ад БДТ-3 такой мастацкай пастаноўкі, у якой была-б паказана наша прыгожая сацыялістычная рэчаіснасць.

Ставячы «Даходнае месца», Е. Міровіч праявіў пэўную смеласць і самастойнасць у трактоўцы гэтае п'есы, якая так многа разоў ставілася на сцэне рускіх тэатраў, рашуча парываючы з традыцыямі вытлумачэння яе. Лейтматывам усяго спектакля Міровіч узяў тыя прагрэсіўныя элементы светапогляду драматурга, якія выявіліся ў рэзкай крытыцы Остроўскім быту расійскага чыноўніцтва ў эпоху царызма. Гэты бок п'есы Міровіч выпукліў, падкрэсліў, надаў яму сатырычную вастрыню, абагульняючы тым самым крытыку быту і норавоў царскага чыноўніцтва Остроўскім да паказу агіднага характару ўсяе сістэмы бюракратычна-чыноўніцкага іерархічнага ладу царскага самадзяржаўя.

Гэта вельмі важна. Такі спосаб асваення класічнае спадчыны з'яўляецца найбольш правільным, а тым больш, калі ён мастацкі апраўданы.

Узяўшы за зыходны пункт рэжысёрскага вырашэння тэмы п'есы сатыру пра чыноўніцтва, Міровіч робіць смелы эксперымент з перагрупоўкаю драматургічнага матэрыялу п'есы, затушоўваючы пабочныя матывы яе, як, напрыклад, матыў любоўнае інтрыгі Вышнеўскай, пераносіць месца дзеі з кватэры Вышнеўскага ў «прысутнічанне». Гэта дало магчымасць пастаноўшчыку даць рад вострых, чагамі пантамімічных мізансцэн, дзе сатыра на царскае чыноўніцтва, на душны свет падхалімства, хабарніцтва, подласці і папірання ўсіх чалавечых пачуццяў дасягае сваёй найбольшай мастацкай сілы і вастрыні.

Пропістаўленне свету Юсавых, Белагубавых і Вышнеўскіх вобразу прагрэсіўнага сумленнага Жадова, ворага падхалімства і хабарніцтва, які прабуе з высока паднятым чалом пераступіць праз усю гэтую агіднасць, яшчэ больш падкрэслівае сатырычную сілу спектакля.

Такая трактоўка п'есы дала магчымасць стварыць спектакль, у якім яскрава выяўляецца тонкая рэжысёрская работа, удумлівая і ласканалая апрацоўка выканаўцамі кожнае дэталі ролі. А гэта якраз і дало магчымасць стварыць, абмінаючы непатрэбны бытавізм або гратэск, сапраўды пераканальную рэалістычную карціну мінулае эпохі.

Зусім зразумела таму, што лепшымі з боку акторскага выканання аказаліся вобразы Юсава (заслужаны артыст рэспублікі А. Згіроўскі), Белагубава (артыст Гарэлаў), Поліпькі (актрыса Л. Шышко), Кукушкінай (актрыса Стройская).

Асаблівую ўвагу звяртае на сябе ў гэтым спектаклі ігра А. Звіроўскага. Граза і страх дробных чыноўнікаў, падначаленых яму, Юсаў пры сустрэчы з найвышэй стаячым на гэтай іерархічнай лесніцы Вышнеўскім у момант ператвараецца ў маленькую ліслівую елейную істоту, на твары якой блукае падабастроеная, пакорлівая ўсмешачка. Выбух смеху ў залі раздаецца калі Юсаў літаральна ўпаўзае, згорбіўшыся ў парыве лакейскае ўгодлівасці і падхалімства, у габінет начальніка дэпартамента. Затое адтуль ён выходзіць ізноў у арэоле ўсяго свайго дробнага вялічча; «там» і «тут» — гэта дзве маскі. Частыя метамарфозы гэтага дваістага аблічча зроблены А. Згіроўскім сапраўды віртуозна.

Звяртае на сябе ўвагу ў ролі Белагубава і параўнаўча малады актор Гарэлаў. У ролі Белагубава актор Гарэлаў паказаў вялікую здольнасць сцэнічнага «перевоплощения», асабліва калі параўнаць з гэтай роляй яго папярэднія ролі. Вобраз дробнага чынушы, кар'ерыста і хабарніка, які лізаблюдствам і падхалімствам прабівае сабе «дарогу ў свет», стварае свой маленькі мяшчанскі добрабыт, паказаны Гарэлавым вельмі ўдала.

Вельмі добра запамінаецца актрыса Л. Шышко ў ролі Поліпькі. Такія сцэнкі, як сцэнка гадання на картах, або сцэнка адыходу ад Жадова выкананы Шышко майстэрскі і сведчаць, што ў асобе Л. Шышко мы маем буйную актрысу камедыйнага жанру.

З іншых выканаўцаў трэба адзначыць артыста Шашалевіча (Голія) і артыстку Стройскую (Букушкіна).

Значна слабей выкананa роля Жадова (заслужаны артыст Дзедзюшка), у якой адчуваецца пэўная непадрапаванасць, і роля Вышнеўскага (артыст Свірчаўскі).

Выклікае супярэчанне ў адным пункце і рэжысёрская трактоўка п'есы. Імкнучыся сканцэнтраваць увагу глядача на раскрыцці асноўнай ідэі — сатырычнага паказу быту і нораваў чыноўніцтва, Е. Міровіч адкідае пабочную інтрыгу з Вышнеўскай, якая замінала раскрыцю асноўнага рэжысёрскага замыслу. Аднак, гэта-ж прывяло да таго, што мастацкая функцыя, ды і наогул надўнасць у спектаклі вобразу Вышнеўскай, засталася невыразнай і ў такім выглядзе нават непатрэбнай. Гэта пытанне рэжысёрам, відавочна, не прадумана да канца.

Гэтыя дробныя заганы не здымаюць, вядома, буйнай мастацкай вартасці спектакля ў цэлым.

«Даходнае месца» сведчыць аб правільнай лініі мастацкага кіраўніцтва БДТ-3, аб жыццездольнасці і творчым росце ўсяго калектыва тэатра.

А. ЗВОНАК. Эд. САМУЙЛЕНАК.



НОВЫ ФРАНЦУЗСКІ САМАЛЁТ-ГІГАНТ

На французскім авіязаводзе Фармана заканчваецца будаўніцтва самалёта-гіганта, які прадназначан для трансатлантычных зносін. Самалёт змяшчае 40 пасажыраў і абсталёван вялікім барам і курыльным пакоем. Хуткасць самалёта — 300 кілометраў у гадзіну. НА ЗДЫМКУ: пабудова новага самалёта на заводзе Фармана.

(СФ).

Усебеларуская нарада работнікаў дзіцячых дамоў

2 кастрычніка адкрылася ўсебеларуская нарада работнікаў дзіцячых дамоў. Нарада павінна падвесці вынікі гадавой работы па рэалізацыі гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці і безнагляднасці.

Першы і другі дзень работы нарады былі прысвечаны абмеркаванню даклада нам. наркома асветы тав. Гершона па гэтаму пытанню. У даклазе, аднак, мала было самакрытыкі і крытыкі буйнейшых недахопаў, якія маюць месца ў дзіцячых дамах і асабліва ў кіраўніцтве імі.

Трэба адзначыць, што ў выступленнях з месц мала было крытыкі і самакрытыкі сваіх недахопаў, мала практычных прапаноў для палепшання работы дзіцячых дамоў. Толькі прадстаўнік ПК саюза дашкольных устаноў т. Брухавецкая рэзка паставіла пытанне аб вялікіх недахопах у дзіцячых дамах і гэтым дапамагла паставіць спрэчкі на прынцыповую вышыню.

Крытыцы падвергнута работа Наркамата аховы здароўя, які дрэнна працуе па санітарнаму абслугоўванню дзіцячых дамоў.

Проста злачынствам трэба лічыць з'явішча, калі асобныя райвыканкомы (Добрушскі і інш.) на працягу месяцаў не адпускаюць дзіцячым дамам іх-жа сродкі і наогул не цікавяцца работай дамоў.

Учора скончыліся спрэчкі і заслухан рад справаздач дырэктароў аб рабоце дзіцячых дамоў.

Сёння на нарадзе пачнуць працаваць секцыі: дашкольна-выхаваўчая, вучэбнай работы, секцыя вытворчага навучання, дашкольнай работы і т. д.

***

Удзельнікі нарады паслалі прывітанне таварышу **Сталіну** і кіраўніку большэвікоў ордэнаноснай Беларусі таварышу **Гікало**.

Адгрузка бульбы Ленінграду

Па раёнах БССР разгарнуліся загатоўкі і адгрузка бульбы Ленінграду. У бягучым годзе БССР дасць для працоўных горада Леніна 271 тыс. тон бульбы, 50 тыс. тон ужо адгружана, 40 тыс. тон падвезена да станцый чыгунак. Штодзённа на Ленінград адгружаюцца эшалоны ў саставе 325 вагонаў.

Наперадзе ідуць раёны Шклоўскі, Мехаўскі, Рудзенскі. Дзесяткі калгасаў, асабліва Слуцкага, Бабруйскага і Жлобінскага раёнаў, датэрмінова поўнасцю выканалі свае планы па здачы бульбы дзяржаве. Калгаснікі даставілі на загатоўчыя пункты ахборную і высокакласную бульбу.

Зусім не разгорнута работа па загатоўках і адгрузцы ў Бярэзінскім, Прапойскім, Касцюковіцкім і Чавускім раёнах.

Ленінградскі гарадскі совет прыслаў раёнам БССР 25 грузавых аўтамашын для дапамогі ў разгортванні загатовак.

НАПЯРЭДАДНІ ЮБІЛЕЮ ЯКУБА КОЛАСА

3 кастрычніка пад старшынствам наркома асветы БССР тав. Дзякава адбылося чарговае пасяджэнне камітэта па правядзенню святкавання 30-годдзя літаратурнай дзейнасці народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа.

Была заслухана інфармацыя раду арганізацый аб ходзе падрыхтоўкі да юбілею.

У 15 школах Менска праведзены даіцячыя ранішнікі, прысвечаныя творчасці народнага паэта. Рыхтуюцца літаратурныя вечары ў школах, на прадпрыемствах і ў калгасах.

Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя Леніна сабрала для юбілейнай выстаўкі багаты матэрыял, які аллюструе творчасць паэта ў дарэвалюцыйны і паслякастрычніцкі перыяд.

Тут будуць прадстаўлены вытрымкі з твораў Коласа аб старой і Совецкай Беларусі, пераклады твораў паэта на мовы народаў СССР, выказванні чытачоў аб Коласе і т. д.

Мастакі Волкаў, Пашкевіч і Гусеў малююць партрэты паэта. Белдзяржкіно выпускае спецыяльны нумар кінохронікі. Ужо зазнят рад момантаў з жыцця і творчасці Коласа.

Беларускі радыёкамітэт арганізуе сустрэчы ля мікрафона паэта з дзецьмі, пісьменнікамі і прадстаўнікамі грамадскасці, а таксама перадачы твораў Коласа на польскай і яўрэйскай мовах.

Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае юбілею, адбудзецца 11 кастрычніка. Пасля пасяджэння лепшыя артыстычныя і музычныя сілы рэспублікі пакажуць інсцэніроўку асобных апавяданняў Коласа і выканаюць песні на словы яго твораў.

ПАЛІГРАФІЧНА-ВЫДАВЕЦКІ КАМБІНАТ У МЕНСКУ

У Менску завершана будаўніцтва вытворчага корпуса Дома друку. Сталіца БССР абагацілася паліграфічна-выдавецкім камбінатам з двух вялікіх корпусоў. Заканчваецца перавод у новае памяшканне буйнейшай ў рэспубліцы друкарні імя Сталіна, якая дагэтуль знаходзілася ў доме Працы. Для друкарні атрымана новае дадатковае абсталяванне — 7 лінатыпаў, 4 друкаваных машыны «Піонер», папераразальныя машыны і інш. Частка абсталявання ўжо ўстаноўлена.

У бягучым квартале друкарня ўпершыню ў БССР атрымлівае офсетмашыну для каляровага друку.

У выдавецкім корпусе, які ўступіў у эксплаатацыю значна раней, размешчана партыйнае выдавецтва, дзяржаўнае выдавецтва, паліграфічны трэст і фабзавуч друкароў. Агульны кошт будаўніцтва Дома друку — звыш 4 мільёнаў рублёў. У 1937 годзе праектуецца пабудова новага літаграфскага корпуса.

Першыя ўсебеларускія стралковыя спаборніцтвы

6 кастрычніка на стрэльбішчы Н-скай дывізіі пачынаюцца першыя ўсебеларускія стралковыя спаборніцтвы паміж камандамі спартыўных арганізацый і таварыстваў. Праграма спаборніцтваў складзена з сучасных міжнародных і ўсесаюзных практыкаванняў і дадатковых двух практыкаванняў для жанчын. Будзе праведзена стральба з баявой і дробнакаліберной вінтовак і з аўтаматычнага пісталета. Мэта спаборніцтва — прыцягнуць лепшыя кадры майстроў стралковага спорту рэспублікі, паказаць высокія ўзоры стралковага майстэрства і ўстанавіць усебеларускія дасягненні па стральбе.

Устаноўлены пераходныя прызы: па практыкаванню № 1—на 300 метраў з баявой вінтоўкі—імя камандарма першага ранга тав. Убарэвіча, па практыкаванню № 2—з баявой вінтоўкі на 600 метраў—імя камісара дзяржаўнай бязапаснасці другога ранга т. Леплеўскага. Астатнія прызы—камітэта па справах фізкультуры і спорту пры СНК БССР. Чэмпіёны будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Спаборніцтвы працягнуцца 3 дні.

КОРАТКА

(АД КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ЗВЯЗДЫ» І БЕЛТА)

⊙ 13 кастрычніка склікаецца пашыраны пленум Белкаапсаюза, у рабоце якога прымуць удзел старшыні акруговых і раённых саюзаў спажывецкай сістэмы, дырэктары райзагаў і старшыні сельпо. Пленум разгледзіць пытанні аб ходзе загатовак і пераводзе кааператыўных арганізацый на новыя формы крэдытавання.

⊙ З 15 кастрычніка пры 25 МТС пачынаюць працаваць чатырохмесячныя курсы падрыхтоўкі трактарыстаў для ўноўарганізаваных МТС. На гэтых курсах звыш 1500 калгаснікаў і калгасніц будуць вывучаць трактары «СТЗ», «ХТЗ» і «У-2.»

БЯЗДЗЕЛЬНІКІ

Скончыўся рамонт, і на падвальным памяшканні па Комсамольскай вуліцы прыбілі шыльду: «Беларускае аддзяленне Саюзфото». Новая ўстанова публікацыі аб падшуканні работнікаў не давала, а неяк адразу іх знайшла. У момант падвал ажывіўся, забегалі і замітусіліся людзі. Прадпрыемства прыняла дзелавы выгляд.

Задачы Белсаюзфото — забяспечыць газеты рэспублікі фотохронікай, раённыя газеты — гатовымі клішэ; выпускаць фотогазеты і фотопаштоўкі. Аднак, гэта толькі задачы. Белсаюзфото зусім не прыступіла да вырабу клішэ. Памяшканне, якое было адведзена для гэтай мэты, занята пад прыватную кватэру загадчыка аддзялення Карпікава. Цяпер кіраўнік аддзялення шукае «падрадчыка», хто-б узяўся за выпуск клішэ. Ён дагаварваецца з друкарнямі, таргуецца, а справа ні з месца.

Асноўная работа па фотохроніцы ў Белсаюзфото нікуды не варта. Не падабраны кадр добрых фотарэпарцёраў. На гэтых пасадах увесь час арудуюць халтуршчыкі. Яны падсоўваюць Белсаюзфото суцэльны брак — прымітыўныя, дрэнна выкананыя здымкі, на якіх цяжка разглядзець змест.

Тэматыка здымкаў вельмі бедная. Калі здымак звязаны з чарговай палітычнай кампаніяй, то, як правіла, газеты атрымліваюць яго з вялікім спазненнем. І такія здымкі невыразны, не перадаюць мэтанакіраванасці кампаніі.

Усяму гэтаму прычына — няўменне і не поўнае разуменне, як трэба працаваць, адсутнасць сувязі з цэнтральнымі і раённымі газетамі рэспублікі, дрэнны падбор работнікаў і, нарэшце, адсутнасць тэматычнага плану работы.

Штат Белсаюзфото велізарны, але працаваць няма каму. Гэта маленькая ўстанова мае вялікі штат у бухгалтэрыі: галоўнага бухгалтара, бухгалтара, эканаміста-планавіка і касіра. Мае двух тэхнічных сакратароў, намесніка загадчыка па распаўсюджанню, упаўнаважанага па распаўсюджанню, загадчыка вытворчасці са сваім штатам работнікаў. Затое няма рэдактароў, і ёсць толькі адзін фотарэпарцёр. Ці патрэбен для аднаго пастаўшчыка фотопрадукцыі такі апарат? Зразумела, не. Увесь гэты разбухшы апарат бяздзейнічае, не загружан работай.

Усе фотарэпарцёры горада нясуць усю забракаваную па месцы іх працы прадукцыю ў Белсаюзфото. Карпікаў іх «тавар» купляе і накіроўвае ў рэдакцыі. Нярэдка Белсаюзфото не пагарджаецца спекульнуць на выгодным «тавары».

У часе манеўраў войск БВА Белсаюзфото мела некалькі здымкаў прыехаўшага спецкора Саюзфото тав. Грыбоўскага. Дзяльцы з Белсаюзфото заключылі з газетай «Рабочий» здзелку на манапольнае забеспячэнне яе гэтымі здымкамі, вядома, за павышаную аплату. Цэнтральныя і раённыя газеты рэспублікі атрымалі гэтыя здымкі на суткі пазней газеты «Рабочий» і то пад вялікім напіскам.

Парад войск БВА адбываўся ў Менску 12 верасня. Белсаюзфото-ж надумалася прысылаць здымкі аб парадзе толькі ў 6 гадзін вечара 13 верасня. 23 верасня ў Менск прыбыла калона вялікага жаночага аўтапрабегу. Рэдакцыі чакалі здымкаў звыш двух дзён, але так і не дачакаліся.

Неаператыўнасць, непісьменнасць і некультурнасць работнікаў Белсаюзфото прыводзяць часта да анекдотаў, да агіднай і злачыннай блытаніны, скрыўлення фактаў, палітычных памылак.

Загадчык аддзялення тав. Карпікаў не здолеў па-большэвіцку паставіць работу маладой установы. Ён не вывучыў сваіх работнікаў, не ведае аб іх самых звычайных анкетных даных. Гэта прыяло да засмечанасці апарата аддзялення людзьмі з «багатым» мінулым, выключанымі з партыі, выхадцамі з іншых партый і т. д. (Брадоцкі, Папоў, Шышко і інш.).

Карпікаў «перагружаны», яму няма часу склаці план, прыгледзецца да сваіх работнікаў, няма часу прапаваць. Ён бездапаможна разводзіць рукамі і скардзіцца на тое, што яму не даюць людзей, але каб самому іх знайсці, падвучыць і выхаваць—на гэта Карпікава... не хапае.

Брыгада «Звязды» і «Чырвонай змены» ЦЫВЕС, НОРТМАН.

Стаханавец гомельскага вагоннага ўчастка т. Жукаў Павел на працягу года не мае ні адной затрымкі і адцепкі вагонаў. Іспыты на веды новых правіл здаў на «добра». НА ЗДЫМКУ: перад адпраўкай поезда т. Жукаў правярае правільнасць запраўкі букс.

Фото Шаевіча (БСФ).

ЯРАВІЗАЦЫЯ ІЛЬНУ У БССР

Інстытут біялогіі Акадэміі навук БССР правёў шырокія вопыты па яравізацыі ільну ў 25 калгасах рэспублікі. Рэзультаты бліскучыя. Агульная даўжыня яравізаванага ільну на 5 — 10 сантыметраў больш, чым звычайнага. Тэхнічная даўжыня на 9 сантыметраў больш звычайнага. Ураджай ільнонасення з яравізаванага ільну перавышае звычайны ўраджай амаль на пэнтнер з гектара. Ёсць таксама павелічэнне каробачнасці ільну. Вопыты кансультаваў акадэмік-ордэнаносец Лысенка. На аснове гэтай работы інстытут біялогіі распрацаваў інструкцыю па масавай яравізацыі ільну па БССР.

АД ПАРТКАЛЕГІІ ПРЫ ЎПАЎНАВАЖАНЫМ КПК ПА БССР

Ніжэйпамянёныя ў спісу тт. выклікаюцца ў Парткалегію пры уп. КПК па БССР (Чырвонаармейская, 16, трэці паверх, пакой № 26) на 7 кастрычніка, к 10 гадз. раніцы, для разбору іх апеляцый і заяў:

Кульбак А. С. (Менск, Варашылаўскі РК КП(б)Б), Пашвенчук І. М. (Клімавічы), Мядведка І. Н. (Лоеў), Курпяк Ф. С., Макарэнка Е. А. (Журавічы), Амельчанка І. М. (Касцюковічы), Цярэшчанка Н. С. (Круглае), Сівакоў А. А. (Гомель), Бяляй І. Н. (Нароўля) Шулікаў А. Г. (Прапойск), Раеўскі С. І. (Орша), Гарэлік Х. Ш. (Даманавічы), Левін С. Л. (Орша).

Парткалегія пры уп. КПК па БССР.

ПАВЕДАМЛЕННІ

— 4 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у памяшканні райпартгабінета Кагановіцкага райкома КП(б)Б (дом Урада, левае крыло, 5 паверх, пакой 501) адбудзецца семінар комсамольскага актыва Кагановіцкага раёна. Тэма — праект новай сталінскай Канстытуцыі.

***

— 5 кастрычніка, у 5 гадзін вечара, у малай зале дома Партактыва склікаецца пленум Сталінскага РК КП(б)Б.

Сакратар Сталінскага РК КП(б)Б ЛІТВІН.

***

— 4 кастрычніка, у 2 гадзіны дня, у памяшканні дома Тэхнікі (Комсамольская, 25) склікаецца нарада сакратароў парткомаў і парторгаў. Кагановіцкага раёна.

Кагановіцкі РК КП(б)Б.

***

— 5 кастрычніка, у 6 гадзін вечара, у памяшканні дома Тэхнікі (Комсамольская, 25) склікаецца чарговы пленум Кагановіцкага райкома КП(б)Б.

Сакратар Кагановіцкага РК КП(б)Б ВАРОНЧАНКА.

***

5 кастрычніка, у 9 гадзін раніцы, у памяшканні дома Партактыва (другі паверх пакой № 18) адбудзецца семінар прапагандыстаў па гісторыі партыі Варашылаўскага раёна.

Культпроп Варашылаўскага РК КП(б)Б.

Ч. в. а. адказнага рэдактара А. П. ДЖЭЛЮК.

ОДБ

Памяшканне ВДТ-1

Спектакі БЕЛДЗЯРЖТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА

СЁННЯ, 4 кастрычніка,

КАРМЭН

Опера ў 4 дзеях, муз. Бізэ.
Білеты ў касе тэатра.
Сёння—абанемент № 16

Прадаўжаецца прыём заявак на сталыя месцы.

Дзіцячы гукавы кінотэатр	ДЗЕЦІ КАПІТАНА ГРАНТА
Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»	Салавей-саловушка
Гукавы кінотэатр «Пролетарый»	ДЗЕЦІ КАПІТАНА ГРАНТА
Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»	ТРОЕ з АДНОЙ ВУЛІЦЫ
Кіно „СПАРТАК"	ЗА РАКОЙ

БЕЛКОМУНБАНК напамінае ўсім забудоўшчыкам і падрадным арганізацыям, што яны абавязаны прадставіць Белкомунбанку наступную справаздачнасць:

1. Справаздачу аб капіталаўкладаннях за ВЕРАСЕНЬ месяц па форме № 13 і квартальную справаздачу аб уводзе ў эксплаатацыю на 1 кастрычніка па форме № 13 не пазней 7 кастрычніка г. г.
2. Баланс за 3 квартал НЕ ПАЗНЕЙ 20 КАСТРЫЧНІКА г. г.

Белкомунбанк папярэджвае, што вінаватыя ў непрадстаўленні справаздачнасці да ўказаных тэрмінаў будуць прыцягнуты да адказнасці.

БЕЛКОМУНБАНК.

Менскі гарадскі страхавы пункт ЦСПСБ доводзіць да ведама

ўсіх пенсіянераў працы гор. Менска і яго раёна, ШТО

на падставе пастановы прэзідыума ЦСПСБ ад 29 верасня 1936 г. абвешчана перарэгістрацыя пенсіянераў усіх трох груп—непрацуючых і працуючых, а таксама сем'яў памерших кармільцаў, пенсіянераў па старасці і за выслугу гадоў.

Рэгістрацыя пачнецца 4 кастрычніка і будзе праводзіцца ў памяшканні ЦСПСБ, пакой № 14 (плян Волі, дом Працы, другі паверх) з 8 гадзін раніцы да 1 гадзіны дня.

Пры яўцы на рэгістрацыю неабходна мець пры сабе наступныя дакументы: дакументы, якія служылі падставай для назначэння пенсіі, пенсійную кніжку, пашпарт даведкі аб працы за апошнія 3 гады.

УВАГА. 1. Працуючыя пенсіянеры прадстаўляюць дадаткова даведку ўстановы або прадпрыемства з указаннем дзе працуе і з якога часу;

2. Інваліды першай групы, якія па стану здароўя не могуць асабіста з'явіцца на перарэгістрацыю, пасылаюць пералічаныя вышей дакументы праз члена сем'і.

Рэгістрацыя будзе праводзіцца наступным чынам:

4 кастрычніка павінны з'явіцца пенсіянеры у якіх у пенсійных кніжках адзначана дата выплаты пенсіі—1 чысла.
5 кастрычніка павінны з'явіцца тыя, у каго дата—2 чысла.
6 кастрычніка — тыя, у каго дата 3 чысла.
7 кастрычніка — тыя, у каго дата 4 чысла.
8 кастрычніка — тыя, у каго дата 5 чысла.
9 кастрычніка — тыя, у каго дата 7 чысла.
10 кастрычніка — тыя, у каго дата 8 чысла.
11 кастрычніка — тыя, у каго дата 9 чысла.
12 кастрычніка — тыя, у каго дата 10 чысла.
13 кастрычніка — тыя, у каго дата 11 чысла.
14 кастрычніка — тыя, у каго дата 13 чысла.
15 кастрычніка — тыя, у каго дата 14 чысла.
16 кастрычніка — тыя, у каго дата 15 чысла.
17 кастрычніка — тыя, у каго дата 16 чысла.
18 кастрычніка — тыя, у каго дата 17 чысла.
19 кастрычніка — тыя, у каго дата 19 чысла.
20 кастрычніка — тыя, у каго дата 20 чысла.
21 кастрычніка — тыя, у каго дата 21 чысла.
22 кастрычніка — тыя, у каго дата 22 чысла.
23 кастрычніка — тыя, у каго дата 23 чысла.
24 кастрычніка — тыя, у каго дата 25 чысла.
25 кастрычніка — тыя, у каго дата 26 чысла.
26 кастрычніка — тыя, у каго дата 27 чысла.
27 кастрычніка — тыя, у каго дата 28 чысла.
28 кастрычніка — тыя, у каго дата 29 чысла.
29 кастрычніка — тыя, у каго дата 30 чысла.

3. Пенсіянерам, якія не з'явяцца на перарэгістрацыю, выплата пенсіі спыняецца.

4. Працуючыя пенсіянеры з'яўляюцца на перарэгістрацыю незалежна ад каляндарнага плана, у свой бліжайшы выходны дзень.

5. Усе прадпрыемствы і ўстановы абавязаны ў нядзённы тэрмін прадставіць у менскі страхпункт спісы працуючых з іх пенсіянераў з указаннем іх заработку і часу паступлення на працу.

МЕНСКІ ГОРСТРАХПУНКТ

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі:

ЛУКЯНЕНКА М. І.—пашпарт; ХАЦАЙ А. Л. — прафбілет; ФІЛІПОВІЧ В. Н.—ваенны білет; ДЗЕШАЎ Я. С. — пашпарт; ГОХШТЭЙН Ф. С. — студэнцкае пасведчанне; БАРЫСАЎ Л. С. — прафбілет; ШЫМАНСКІ П. П. — пашпарт; ЛІННІЦКІ А. П. — пропуск на завод імя Кірава; ДЗМІТРОВІЧ А. І. — пашпарт; ВАЎЧОК В. С. — пашпарт і ваенны білет; КАЛЕНДА Я. Я.—паляўнічы білет; ДОРДАЛЬ Р. Т. — пашпарт і ваенны білет; ГАРАВОЙ П. С.—пашпарт; ТАЛЯРУК П. І. — пропуск на завод імя Молатава; АНІСОВІЧ І. А. — заліковая кніжка; ЮФЕ І. Н. — прафбілет; КЛІМЧУК А. П — комсамольскі білет № 5028297 і віза; ШЧОРС З. А. — метрыка; САЦУК К. І. — пашпарт; АСТАШОНАК Н. Я.—пашпарт № 247860 і ваенны білет. ТАРАЙКОЎСКІ А. М.—брачная выпіс; АНУПКА Г. Е. — ваенны білет; ЛАКУМОВІЧ Р. Я. — пашпарт, комсамольскі білет; ЛАПЕКА А. М. — пашпарт № 107237; САМУЙЛОВІЧ Я. Д. — ваенны білет; ЛУКШЫН П. П. — пашпарт; КАЗЛОЎСКІ А. Я — пашпарт № 153925 і ваенны білет; САФОНАЎ С. П — стажорская карчачка шофера, выд. кваліфік. камісіяй; КЛІМОВІЧ В. А. — значок СПХА № 403075; ГУЗ Б. К.—абавязацельства аб здачы мяса; Беларыцкі І. Б. — пашпарт; Уллянер Ш. А. — пашпарт; Котов І. М. — пенсійная кніжка; Цыбульскі Е. В. — пашпарт.

СПЕРМОКРИН

испытан клинически, рекомендован врачами при артериосклерозе, половой „общей неврастении, старческой слабости, малокровии" и проч.

Требуйте во всех аптеках

ФАБРИКА ЭНДОКРИННЫХ ПРЕПАРАТОВ ГАПУ НКЗдрава СССР МОСКВА

ПОСЫЛГОСТОРГ

Московская контора Государственной посылочной торговли

высылае ўсім грамадзянам па іх запатрабаванню паштовымі пасылкамі:

ГАЛАНТАРЭЙНА-ТРЫКАТАЖНЫЯ ТАВАРЫ:

Касцюмы дзіцячыя для хлопчыкаў на 6—7 год — 13 р. 85 к. (райтузы і світры белага колеру).
Світры дзіцячыя на 4—5 год белыя — 6 р. 15 к.
Світры дзіцячыя на 4—5 год каляровыя — 7 р.
Жаночыя джэмперы (кімано з адкрытым воратам і кароткімі рукавамі) размер 44—46 — 18 р. 10 к.
Жаночыя джэмперы (кімано з адкрытым воратам і кароткімі рукавамі) размер 48—50 — 19 р. 50 к.
Блузкі разм. 44—48 — 22 р.
Пярчаткі трыкатажныя цёплыя мужчынскія 2 р. 65 к., 3 р. 30 к., 3 р. 70 к.
Пярчаткі трыкатажныя цёплыя жаночыя 2 р. 85 к., 2 р. 60 к.,
Панчохі бавоўняна-папяровыя жаночыя дзяржфабрык — 4 р. 70 к., 4 р. 80 к., 5 р. 30 к.

МЕТАЛА-ГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫ:

Керасінкі 2-фіцільныя «ГРЭЦ» завода «МЕТАЛЛОЛАМП» 17 р. і 10 р.
Прымусы тульск. дзярж. завода—25 р. 75 к.
Прымусы з запасной гарэлкай—31 р. 70 к.
(запасныя гарэлкі адны не высылаюцца).
Мясарубкі № 5—16 р.
Нажы сталовыя з відэльцамі адпастальныя — 3 р. 20 к. і 3 р. 70 к. пара.
Нажніцы гаспадарчыя — 3 р. 05 к. 3 р. 45 к. і 4 р. 65 к.

Ва ўказаныя цэны ўваходзяць усе выдаткі па тары, упакоўцы і паштовай перасылцы.

Заказы выконваюцца па атрыманні грошай. Наложаным плацяжом тавары не высылаюцца.
Грошы пераводзіце паштовым пераводам.
Заказы пішыце на адвароце адрэснага талона паштовага перавода.
Ваш адрас пішыце падрабязна і разборліва з указаннем паштовага аддзялення, вобласці, раёна, сяла, прозвішча, імя і імя па бацьку поўнасцю.

ЗАКАЗЫ І ГРОШЫ ШЛІЦЕ ПА АДРАСУ: МОСКВА, УЛ КИРОВА, 47/3. М. «ПОСЫЛГОСТОРГУ».

Наш разліковы рахунак № 460019 у Дзяржбанку — цэнтральнае аддзяленне. «ПОСЫЛГОСТОРГ».

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРМАГ
«СОЮЗУНИВЕРМАГА» НКУГ СССР
ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
РАДЫЕПРЫЕМНІКІ
«СИ-235» і «БИ-234» (калгасныя)
З ПОЎНЫМ КАМПЛЕКТАМ ЛАМП І БАТАРЭЙ
Цана прыёмніка „СИ-235"—300 руб. 55 кап.
Для выгоды пакупнікоў універмагам праводзіцца ўстаноўка прыёмнікаў на дому (за асобную плату).

Першаму Белдзяржтэатру ПАТРЭБНЫ
гардэробшчыкі для вешалкі, істапнікі і рабочыя для сцэны.
З прапановамі звяртацца ў канцылярыю тэатра — рог вул Энгельса і Карла Маркса штодзень з 11 да 3 гадзін дня.

ТАМАТЫ ПАЛЯПШАЮЦЬ СМАК АБЕДАЎ

Заводы Галоўкансерва з кожным годам выпускаюць усё больш і больш тамат-пасты і тамат-пюрэ: спажыванне гэтых прадуктаў трывала ўвайшло ва ўжытак самых шырокіх пластоў насельніцтва.

Чым-жа растлумачыць такое шырокае распаўсюджанне таматапрадуктаў?

Тамат-паста і тамат-пюрэ прадстаўляюць сабой раздробленую мякаць памідор, угатаваных у беспаветраным прасторы да адной сёмай часткі свайго першапачатковага аб'ёму (шэсць сёмых памідора — гэта вада, якая пры ўгатаванні выпараецца). У таматапрадуктах поўнасцю захаваны ўсе смакавыя і пажыўныя ўласцівасці памідор і, такім чынам, дзякуючы тамат-пасце і тамат-пюрэ гаспадыні маюць магчымасць замяняць памідоры ў тыя месяцы, калі яны адсутнічаюць на рынку.

Таматапрадукты паляпшаюць любое блюда: нават іх нязначнай колькасці, дабаўленай у суп, боршч, або соус, дастаткова для таго, каб надаць апошнім прыгожы і апетытны выгляд, прыемны смак і арамат.

На заводах Галоўкансерва таматпаста і тамат-пюрэ вырабляюцца толькі са свежых, зусім спелых, непашкоджаных памідор, вырашчаных пад наглядам аграномаў. Уся вытворчасць поўнасцю механізавана і дае магчымасць выпускаць таматапрадукты высокай якасці, захоўваючы ў іх уласцівыя памідорам колер, смак, пах і ўсе каштоўныя якасці. Гэта трэба мець на ўвазе пры куплі тамат-пасты і тамат-пюрэ заводаў Галоўкансерва.

«Саюзкансервбыт».

ПАТРЭБЕН ЧОРНАРАБОЧЫ
Звяртацца: Совецкая 63, 2-гі паверх, выдавецтва „ЗВЯЗДА"

БАРЫСАЎСКІ ЛЕСПРАМГАС
згодна пастановы СНК БССР ад 8 верасня 1936 г.
ЛІКВІДУЕЦЦА.
Усе прэтэнзіі прад'яўляць да 15 кастрычніка г.г. Пасля гэтага тэрміну прэтэнзіі прымацца не будуць.
Новабарысаўскі лясны склад леспрамгаса (Берэзтка) з 1 кастрычніка г.г. выдзяляецца ў самастойную адзінку трэста «Лесбел».
ЛІКВІДКОМ.

Тыраж 90 536 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—5748.